Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"
Кафедра дашкольнай і пачатковай адукацыі

# КУРСАВЫЯ І ДЫПЛОМНЫЯ ПРАЦЫ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Метадычныя рэкамендацыі***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2025*

УДК 378.147.091.313:373.5.016:811.161.3(075.8)
ББК 74.268.19=411.3р30я73+74.480.278я73
К93

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 1 ад 08.09.2025.

Складальнік: прафесар кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар педагагічных навук, прафесар **Л.С. Васюковіч**

Р э ц э н з е н т :
дацэнт кафедры педагогікі, прыватных методык і менеджменту адукацыі Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт *С.В. Мартынкевіч*

**К93** **Курсавыя і дыпломныя працы па методыцы выкладання беларускай мовы :** метадычныя рэкамендацыі / склад. Л.С. Васюковіч. — Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2025. — 52 с.

Метадычныя рэкамендацыі актуалізуюць тэхналогіі падрыхтоўкі курсавых і дыпломных прац па методыцы выкладання беларускай мовы. Прапануецца характарыстыка метадалагічных параметраў даследавання. Даюцца парады да працы з навуковым тэкстам.

Прызначаны для студэнтаў педагагічнага факультэта (спецыяльнасць 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя).

**УДК 378.147.091.313:373.5.016:811.161.3(075.8)**
**ББК 74.268.19=411.3р30я73+74.480.278я73**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2025

# ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска ............................................................................ 4

1 Месца курсавой/дыпломнай працы ў сістэме падрыхтоўкі будучага настаўніка ............................................................................ 8

2 Структура курсавой/дыпломнай працы ............................................ 11

3 Метадалагічны каментарый да прац па методыцы выкладання беларускай мовы (з улікам аб’екта і прадмета даследавання) ......... 34

3.1 Методыка вывучэння фанетыкі і графікі ............................ 35

3.2 Методыка вывучэння лексікі ............................................... 37

3.3 Методыка вывучэння складу слова і словаўтварэння ........ 39

3.4 Методыка вывучэння марфалогіі ........................................ 41

3.5 Методыка вывучэння сінтаксісу ......................................... 43

4 Сістэматызацыя крытэрыяў ацэнкі якасці праведзенага даследавання ............................................................................ 44

Заключэнне ............................................................................ 48

Спіс выкарыстаных крыніц ............................................................ 49

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Валоданне навыкамі правядзення навуковага метадычнага даследавання выступае не толькі істотным сродкам прафесійнага росту педагога, але і фактарам развіцця сучаснага адукацыйнага працэсу. Вядучыя даследчыя ўменні набываюцца падчас выканання курсавых і дыпломных прац. Як вядома, *курсавая праца* мае творчы даследчы характар, скіравана на развіццё ўніверсальных кампетэнцый студэнта па выбранай спецыяльнасці, назапашванне практычных уменняў і навыкаў падчас правядзення даследавання[1].

Прафесійная падрыхтоўка будучых настаўнікаў падразумявае, апроч глыбокіх ведаў, засваенне навыкаў даследчай дзейнасці. Набытыя навыкі будуць суправаджаць дыпламаванага настаўніка і на наступных этапах прафесійнай кар’еры — пры падрыхтоўцы работ для атэстацыі і павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі. У падобных працах фіксуецца і абагульняецца педагагічны вопыт, даказваецца яго эфектыўнасць, прыводзяцца перавагі ўласнай навукова-метадычнай пазіцыі.

*Мэта падрыхтаваных метадычных рэкамендацый* — прапанаваць студэнтам педагагічнага факультэта метадычны інструментарый для якаснага выканання курсавой/дыпломнай працы. Мы палічылі мэтазгодным запазычыць лепшыя ідэі, аптымальныя напрацоўкі вучоных-метадыстаў (работы прыведзены ў спісе выкарыстанай літаратуры) з мэтай сістэматызаваць наяўныя здабыткі і папярэдзіць студэнтаў ад выпадковага выбару крыніц, размешчаных на прасторах інтэрнэту.

У працэсе падрыхтоўкі навуковай працы студэнт павінен навучыцца:

– выяўляць і фармуляваць надзённыя праблемы педагагічнай навукі і адукацыйнай практыкі;

– аналізаваць сучасны ўзровень даследаванай праблемы і ўласную эксперыментальную працу;

– ажыццяўляць бібліяграфічны пошук, працаваць з навуковай літаратурай і ацэньваць яе ў кантэксце тэмы курсавой/дыпломнай;

– пісьменна, лагічна, доказна, у навуковым стылі афармляць матэрыял;

– структураваць, сістэматызаваць сабраны матэрыял;

– рабіць бібліяграфічнае апісанне выкарыстаных крыніц у адпаведнасці з агульнапрынятымі стандартамі.

У працэсе выканання курсавой/дыпломнай працы студэнт павінен

**ведаць:**

– праграмны матэрыял у адпаведнасці з накірункам адукацыйнай падрыхтоўкі і зместам вучэбных дысцыплін;

– патрабаванні да даследчай працы;

– структуру і логіку прыкладно′га метадычнага даследавання, паслядоўнасць размяшчэння яго кампанентаў з мэтай вырашэння сфармуляванай праблемы;

---

[1]Порядок организации выполнения и защиты, оформления рефератов, курсовых проектов (курсовых работ), дипломных проектов (дипломных работ), магистерских диссертаций. — Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2025. — 82 с.

**умець:**

– аналізаваць актуальныя праблемы сучаснай пачатковай адукацыі;

– прымяняць на практыцы тэарэтычныя веды для рэалізацыі задач даследчай дзейнасці;

– усведамляць і вырашаць задачы курсавой/дыпломнай працы, самастойна распрацоўваць, праектаваць, мадэляваць, ацэньваць тэарэтычныя і практычныя здабыткі па тэме;

– планаваць ход даследавання;

– працаваць з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай;

– прымяняць метады навуковага даследавання з мэтай вырашэння акрэсленай праблемы;

– рабіць аргументаваныя вывады;

– узаемадзейнічаць у дыялогавым рэжыме з навуковым кіраўніком і з іншымі суб’ектамі адукацыйнага працэсу;

**мець навыкі:**

– планавання і арганізацыі даследчай дзейнасці, працы з інфармацыяй (самастойны пошук і аналіз матэрыялу, яго абагульненне і сістэматызацыя);

– пісьменнага навуковага выкладу тэксту;

– выкарыстання сучасных інфармацыйных сродкаў (у тым ліку інструментаў і тэхналогій штучнага інтэлекту);

– афармлення вынікаў даследавання, аналізу ўласнай даследчай дзейнасці (напрыклад, з дапамогай крытэрыяў і паказчыкаў, паводле якіх курсавая/дыпломная праца ацэньваецца навуковым кіраўніком/рэцэнзентам);

– прымянення метадаў даследавання, методыкі правядзення педагагічнага эксперымента, аналізу якасных і колькасных вынікаў эмпірычнага даследавання;

– уразумення персанальнай адказнасці за ход і вынікі даследавання, своечасовае прадстаўленне выкананай працы навуковаму кіраўніку, тэарэтычнай і практычнай значнасці зробленага;

– каштоўнасных адносін да даследчай дзейнасці як да магчымасці павышэння ўласнага прафесіяналізму, здольнасці і гатоўнасці да правядзення самастойнай працы.

Выкананне курсавой/дыпломнай працы праходзіць наступныя *арганізацыйна-зместавыя этапы*:

1. *Падрыхтоўчы*: выбар і фармулёўка тэмы даследавання, зацвярджэнне тэмы і навуковага кіраўніка. У фармулёўцы тэмы павінны адлюстроўвацца аб’ект і (або) прадмет даследавання (аднак гэтыя фармулёўкі не паўтараюцца даслоўна). Не рэкамендуюцца празмерна шырокія/вузкія тэмы. Фармулёўка павінна ўдакладняць, канкрэтызаваць вядучы аспект працы. Надзвычай важна ўсведамляць кожны тэрмін/паняцце ў фармулёўцы тэмы, разумець, што яны павінны знайсці адлюстраванне ў назвах асноўных структурных кампанентаў, раздзелаў, падраздзелаў), адпаведных логіцы і зместу працы. Так, курсавая праца ўтрымлівае звычайна дзве главы (тэарэтычная і практычна-эксперыментальная). Колькасць падраздзелаў у раздзелах павінна быць суадносная (як правіла, дзве-тры ў кожным раздзеле).

На падрыхтоўчым этапе студэнт знаёміцца з нарматыўна-прававой базай па тэме даследавання, інструктыўна-метадычнымі матэрыяламі, парадкам афармлення навуковых прац, прынятым ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

2. *Асноўны этап* курсавой/дыпломнай працы ўключае:

– складанне індывідуальнага графіка работы — сумесна з навуковым кіраўніком. Студэнт атрымлівае заданне на выкананне працы ад кіраўніка;

– тэарэтычнае асэнсаванне стану даследаванай праблемы з абавязковым аналізам прац айчынных і замежных даследчыкаў;

– першаснае канструяванне (апісанне) метадалагічнага апарату даследавання, прадугледжанага ўводзінамі. Пасля напісання тэксту працы студэнт вяртаецца да афармлення метадалагічнага кампанента з мэтай яго ўдасканалення, паглыблення;

– падрыхтоўку і афармленне першай (тэарэтычнай) главы;

– выбар метадаў і методык;

– правядзенне эмпірычнага даследавання (збор дадзеных праз заданні канстатуючага, навучальнага, кантрольнага эксперыментаў);

– падрыхтоўку эмпірычнай главы даследавання;

– афармленне вывадаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадаткаў.

3. *Завяршальны* этап выканання працы:

– афармленне курсавой/ дыпломнай у адпаведнасці з патрабаваннямі;

– афармленне прэзентацыі да выкананага даследавання;

– працэдура абароны і ацэньвання курсавой/дыпломнай працы.

Курсавая працы па “Методыцы выкладання беларускай мовы” характарызуецца наступнымі ўласцівасцямі:

– *мэтанакіраванасць*: карэктна сфармуляваная мэта павінна быць дасягнута праз вырашэнне канкрэтных задач даследавання;

– тэарэтычная аснова працы (падыходы, канцэпцыі, прынцыпы і інш.), якая вызначае логіку даследавання, выступае вынікам самастойнага пошуку і засваення літаратуры па праблеме;

– дастатковы аб’ём фактычнага матэрыялу;

– абгрунтаванасць вывадаў;

– правільнасць, выразнасць афармлення ўсіх структурных кампанентаў тэксту даследавання: рэферат, уводзіны, змест, тэарэтычная, эмпірычная главы, вывады па главах, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц.

У працэсе выканання курсавой/дыпломнай працы фарміруюцца наступныя *ўніверсальныя кампетэнцыі*:

УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі.

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і самаўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці.

УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці.

Такім чынам, студэнцкае даследаванне скіравана на атрыманне новых ведаў пра заканамернасці, механізмы навучання і выхавання, методыку арганізацыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу, яго змест, прынцыпы, метады

і арганізацыйныя формы. Курсавая/дыпломная праца як самастойнае даследаванне адрозніваецца ад стыхійна-эмпірычнага погляду на праблему сродкамі пазнання, маўленчага афармлення, характарам мэтавызначэння, патрабаваннямі да выкарыстання, дакладнасцю выкарыстанага паняційна-тэрміналагічнага апарату.

Апроч навыкаў працы з першакрыніцамі, студэнт у працэсе даследчай работы вучыцца:

– планаваць выкананне даследавання, вызначаць яго этапы і тэрміны завяршэння;

– фармуляваць метадалагічныя параметры працы — аб’ект, прадмет, мэта, задачы, тэарэтычныя асновы і інш.;

– усведамляць, абгрунтоўваць логіку пабудовы ўласнага даследавання;

– апісваць працэс рэалізацыі педагагічных умоў, якія забяспечваюць дасягненне запланаваных вынікаў;

– распрацоўваць праграму вопытна-эксперыментальнай працы;

– ствараць схемы, табліцы, графікі, якія ілюструюць працэс дасягнення мэты; тлумачыць і аргументаваць мэтазгоднасць кожнага графічнага аб’екта;

– рабіць вывады, абагульненні на аснове ўласных матэрыялаў і прац іншых аўтараў;

– апрацоўваць вынікі эксперыментальнай працы і аргументаваць іх верагоднасць.

Такім чынам, выкананне курсавой/дыпломнай працы ўключае наступныя этапы:

– выбар і зацвярджэнне тэмы;

– азнаямленне з асноўнымі патрабаваннямі, што прад’яўляюцца да даследавання, да афармлення спасылак, літаратуры;

– складанне плана і яго ўзгадненне з навуковым кіраўніком;

– вызначэнне мэты, задач, аб’екта і прадмета даследавання;

– падбор і вывучэнне крыніц, нарматыўнай базы па тэме працы;

– падрыхтоўка, арганізацыя і правядзенне вопытна-эксперыментальнага даследавання;

– рэдагаванне чарнавога варыянта курсавой/дыпломнай працы;

– канчатковая падрыхтоўка працы да абароны, стварэнне прэзентацыі.

# 1 МЕСЦА КУРСАВОЙ/ДЫПЛОМНАЙ ПРАЦЫ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА

Курсавая/дыпломная праца — самастойнае даследаванне, якое ажыццяўляецца з дапамогай навуковага кіраўніка. Навуковы кіраўнік кансультуе студэнта па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай даследавання, кантралюе ход і вынікі яго выканання, прымае рашэнне адносна гатоўнасці да абароны. *Асноўныя задачы* ў працэсе падрыхтоўкі курсавой/дыпломнай працы:

– сістэматызаваць, паглыбляць тэарэтычныя веды па дысцыплінах дзяржаўнага кампанента вучэбнага плана па спецыяльнасці, прымяняць веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач працы;

– замацоўваць формы навукова-пазнавальнай дзейнасці (адбор, групоўка, аналіз, абагульненне інфармацыі, выяўленне ступені верагоднасці вывадаў, іх доказнасці);

– распрацоўваць метадалагічны апарат для абгрунтавання актуальнасці тэмы, фармулёўкі праблемы даследавання, мэт і задач працы, тэарэтычнай базы, тэарэтычнай і практычнай значнасці даследавання, усведамлення этапаў працы;

– фарміраваць уменні працаваць з інфармацыйнымі рэсурсамі, аналізаваць, абагульняць, сістэматызаваць сабраны матэрыял;

– падбіраць і распрацоўваць дыягнастычны інструментарый;

– засвойваць алгарытм эмпірычнай дзейнасці, скіраванай на выяўленне рэальнага ўзроўню даследаванага феномена, інтэрпрэтацыю, абагульненне і прадстаўленне вынікаў эксперыментальнай працы, фармулёўку вывадаў, паслядоўнае і доказнае іх апісанне;

– праводзіць колькасны і якасны аналіз эксперыментальных дадзеных;

– даваць аб'ектыўную самаацэнку працэсу і вынікаў уласных дасягненняў, праводзіць іх апрабацыю падчас выступленняў на студэнцкіх канферэнцыях/семінарах;

– назапашваць вопыт публічнай прэзентацыі і абароны вынікаў уласнай даследчай дзейнасці.

Курсавая/дыпломная праца па методыцы выкладання беларускай мовы паводле фармулёўкі мэты і задач можа мець *аглядава-тэарэтычны* або *вопытна-пошукавы* характар.

Даследаванне *аглядава-тэарэтычнага характару* мае на ўвазе вывучэнне гісторыі пытання, ступені распрацаванасці праблемы, параўнальны аналіз тэарэтычных падыходаў, створаных мадэлей, педагагічных канцэпцый. У заключэнні такая праца павінна ўтрымліваць вывады і рэкамендацыі адносна магчымасцей практычнага выкарыстання

матэрыялаў даследавання. Змест працы аглядава-тэарэтычнага характару дапаўняецца апытваннем настаўнікаў, навучэнцаў, аналізам статыстычных дадзеных, аглядам інтэрнэт-матэрыялаў, мэта якіх — пацвердзіць актуальнасць даследаванай тэмы, выявіць адносіны рэспандэнтаў да праблемы і ацаніць стан яе вывучанасці.

Курсавая/дыпломная праца *вопытна-пошукавага характару* ставіць задачай паглыблены тэарэтычны аналіз праблемы. Метадалагічна граматны выклад палажэнняў магчымы толькі на аснове нефармальнага прачытання, уразумення "чужых" тэкстаў, асэнсаваных пад вуглом уласнага бачання тэмы. Дэталёвае знаёмства з працамі па праблеме даследавання мае задачай ацаніць логіку і вывады, да якіх прыходзяць аўтары іншых публікацый. У працэсе чытання мэтазгодна акцэнтаваць увагу на пытаннях: *Што і як сцвярджае аўтар? Да якіх вывадаў прыходзіць? Якія тэзісы, думкі маюць арыгінальны і перспектыўны характар?*

Выказванні даследчыкаў з мэтай уключэння ва ўласны тэкст афармляюцца з пазначэннем старонак цытаванай працы. З адной крыніцы мэтазгодна выпісваць не больш за 2–3 неаб'ёмныя выказванні. Для крышталізацыі сваёй пазіцыі выдзяляюцца думкі, што з'яўляюцца ў працэсе чытання, фармулююцца патэнцыяльныя пытанні, якія ўдакладняюць ідэі, фіксуюць супярэчнасці ў разважаннях.

Для паступовага фармулявання ўласных тэзісаў, каментарыяў варта выпісваць асноўныя палажэнні прачытанага паводле схемы:

1) тэзісы/праблема даследавання;

2) аргументы/контраргументы вучонага;

3) вывады аўтара.

Гэтыя моманты істотныя для запамінання зместу працы, абагульнення, інтэграцыі вядучых ідэй першакрыніц.

Пры афармленні тэксту курсавой/дыпломнай працы павінна быць зразумела, у якіх выпадках выкладаецца ўласнае бачанне, у якіх — пазіцыя іншых аўтараў. Каб падкрэсліць асабістыя меркаванні, варта выкарыстоўваць наступныя звароты:

*з нашага пункту погляду, паводле нашага меркавання, як думаецца, нам уяўляецца, у адпаведнасці з ідэямі/падыходамі, прадстаўленымі ў нашым даследаванні, згодна пазіцыі/канцэпцыі нашага даследавання, мы лічым/мяркуем, на аснове праведзенага аналізу, вынікаў вопытна-эксперыментальнай працы можам сцвярджаць, што.., выкананы аналіз дазваляе/дае падставу/магчымасць.., зыходзячы з названых доказаў/аргументаў.., можна заключыць, што.., падкрэслім, адзначым* і інш.

*Другая глава* падразумявае апісанне вопытна-эксперыментальнай працы, што патрабуе:

– правядзення педагагічнага эксперымента для выяўлення рэальнага і аптымальнага ўзроўню вывучанага працэсу;

– распрацоўкі метадычных рэкамендацый, прызначаных да педагогаў, бацькоў, навучэнцаў на аснове праведзенага даследавання;

– актуалізацыі педагагічных сродкаў (методык, тэхналогій, праграм) для вырашэння праблем, выяўленых падчас эмпірычнага даследавання;

– вызначэння эфектыўнасці выбраных метадаў і прыёмаў.

З мэтай падкрэсліць спецыфіку курсавых і дыпломных прац нагадаем параўнальныя характарыстыкі гэтых даследаванняў (табліца 1).

Табліца 1 — Параўнальныя характарыстыкі курсавой і дыпломнай прац

| Курсавая праца | Дыпломная праца |
|---|---|
| **Мэта даследавання** | |
| Мэта курсавой як працы даследчага характару — паглыбленае вывучэнне дысцыплін, засваенне навыкаў навукова-даследчай работы, валоданне методыкай эксперымента, фарміраванне ўменняў публічнай абароны ўласных вынікаў | Мэта дыпломнай працы — паглыбленне тэарэтычных і практычных ведаў, фарміраванне навыкаў самастойнай навуковай працы, засваенне методыкі навуковага даследавання і эксперымента, фарміраванне навыкаў абагульнення і аналізу вынікаў, атрыманых іншымі навукоўцамі |
| **Аб’ём працы** | |
| Не менш за 25–30 старонак устаноўленага фармату | Не менш за 45 старонак (без уліку спісу крыніц і дадаткаў) |
| **Колькасць падраздзелаў** | |
| 3-4 падраздзелы | 5–6 падраздзелаў |
| **Кампаненты ўводзін** | |
| Актуальнасць тэмы даследавання | Актуальнасць тэмы даследавання |
| – | Праблема даследавання |
| Аб’ект даследавання | Аб’ект даследавання |
| Прадмет даследавання | Прадмет даследавання |
| Мэта даследавання | Мэта даследавання |
| Задачы даследавання | Задачы даследавання |
| Метады даследавання | Метады даследавання |
| – | Эксперыментальная база даследавання |
| Тэарэтычная значнасць працы | Тэарэтычная значнасць працы |
| Практычная значнасць працы | Практычная значнасць працы |
| Апісанне структуры працы | Апісанне структуры працы |
| **Колькасць крыніц па тэме даследавання** | |
| Не менш за 20–25 крыніц | Не менш за 50 крыніц |
| **Мэта вопытна-эксперыментальнай працы** | |
| Назапашванне фактаў для эмпірычнага пацвярджэння праблемы | Назапашванне фактаў для тэарэтычнага і эмпірычнага пацвярджэння праблемы |
| **Разнавіднасці вопытна-эксперыментальнай працы** | |
| Канстатуючы эксперымент (апісанне, назіранне, аналіз і вывады) | Канстатуючы эксперымент, навучальны эксперымент, кантрольны эксперымент |
| **Узровень абагульнення інфармацыі** | |
| Абагульненне мае тэарэтыка-эмпірычны характар | Абагульненне мае тэарэтычны і эмпірычны характар |

| Апісанне вынікаў вопытна-эксперыментальнай працы | |
|---|---|
| Праводзіцца канстатуючы эксперымент. Фармулююцца вынікі канстатуючага эксперымента | Праводзяцца канстатуючы, навучальны і кантрольны эксперыменты. Падаецца параўнальная характарыстыка вынікаў канстатуючага і кантрольнага этапаў эксперымента |
| **Дадатак** | |
| Дадатак (пры неабходнасці) | Дадатак да дыпломнай працы |

# 2 СТРУКТУРА КУРСАВОЙ/ДЫПЛОМНАЙ ПРАЦЫ

***Тэма курсавой/дыпломнай працы.*** Праца над курсавой/дыпломнай па ўсіх раздзелах методыкі выкладання беларускай мовы пачынаецца з выбару тэмы даследавання. Заўважым, што яна можа карэкціравацца ў працэсе напісання, аднак усе змены ажыццяўляюцца да зацвярджэння тэмы на кафедры, на якой выконваецца праца. Выбар тэмы можа адбывацца наступнымі шляхамі:

1) тэму можна выбраць, карыстаючыся спісам тэматыкі курсавых прац, прапанаваных навуковым кіраўніком/кафедрай;

2) самастойна вызначыцца з накірункам даследавання, канчаткова сфармуляваць тэму з дапамогай навуковага кіраўніка;

3) сфармуляваць тэму самастойна, зыходзячы з актуальнасці педагагічнай праблемы на сучасным этапе развіцця лінгваметодыкі.

*Тэма* фармулюецца такім чынам, каб з яе вынікала, якую *праблему* даследуе студэнт, *што* ён хоча атрымаць у працэсе даследчай дзейнасці (якая яе мэта і вынікі), *хто* складае суб’ектную аснову даследавання, *як, якімі сродкамі* будзе вырашацца заяўленая праблема, *дзе,* на базе якой установы адукацыі праводзіцца эксперыментальная праца па тэме (табліца 2).

Табліца 2 — Параметры для фармулёўкі тэмы даследавання

| Што? | Хто? | Як? | Дзе? |
|---|---|---|---|
| Мэта, вынікі | Суб’ектная аснова | Сродкі дасягнення | База даследавання |

Напрыклад, тэма “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*” прадугледжвае наступныя параметры фармулёўкі: *мэта/вынік* — фарміраванне самастойнасці навучэнцаў; *суб’ектная аснова* — навучэнцы I–IV класаў; *сродкі* — самастойнае выкананне заданняў, складанне алгарытмаў навучэнцамі і г.д. на ўроках беларускай мовы; *база даследавання* — афіцыйная назва ўстановы адукацыі, у якой будзе праводзіцца эксперыментальная праца.

***Уводзіны*** — візітная картка работы. Ад таго, наколькі пісьменна, навукова, карэктна, глыбока (разам з тым лаканічна) афармлены кампаненты ўводзін, залежыць агульнае ўражанне ад праведзенага даследавання. Структурнымі кампанентамі ўводзін з'яўляюцца наступныя.

***Актуальнасць тэмы даследавання.*** Актуальнасць падразумявае абгрунтаванне значнасці вывучэння заяўленай тэмы на сучасным этапе развіцця навукі і практыкі. Істотна, каб актуальнасць была пацверджана на **тэарэтычным** (*тэма адпавядае сучасным запытам педагагічнай навукі і практыкі, раскрыта не ва ўсіх аспектах* і інш.) і **практычным** (*вынікае з запатрбаваных задач сучаснай адукацыі, пацвярджаецца статыстычнымі дадзенымі, аўтарытэтнымі выказваннямі* і інш.) узроўнях. Падчас абгрунтавання актуальнасці тэмы рэкамендуецца:

а) прадэманстраваць сувязь тэмы даследавання з надзённымі праблемамі і перспектывамі развіцця пачатковай адукацыі (дарэчнай будзе спасылка на нарматыўныя дакументы сферы адукацыі, прынятыя ў апошнія гады: Кодэкс РБ аб адукацыі, Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі да 2030 года, нарматыўна-прававыя акты Міністэрства адукацыі РБ і інш.);

б) ахарактарызаваць стан вывучанасці тэмы з указаннем асноўных падыходаў, канкрэтызаваных працамі айчынных і замежных аўтараў. Неабходна зрабіць агляд крыніц па тэме даследавання, называючы манаграфіі, аўтарэфераты, навукова-метадычныя артыкулы, змешчаныя ў прафесійных часопісах "Пачатковая школа", "Пачатковае навучанне", "Начальное образование" і інш., матэрыялы міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый. Лагічна назваць, якія аспекты/пытанні праблемы засталіся недаследаванымі/маладаследаванымі;

в) прапанаваць агульную характарыстыку даследаванага метадычнага феномена ў рэчышчы тэмы курсавой/дыпломнай працы;

г) пацвердзіць актуальнасць праз новыя сродкі, тэхналогіі з улікам іх інавацыйнасці, недастатковай вывучанасці;

д) канстатаваць запатрабаванасць у канкрэтных практычных рэкамендацыях па вывучэнні тых ці іншых раздзелаў/тэм.

Перспектыўны момант — сфармуляваць **праблему даследавання**, якая будзе вырашана ў ходзе працы. Мэтазгодна, каб першы сказ ва ўводзінах скіроўваўся на вызначэнне і актуалізацыю праблемы, выяўленне пэўнай супярэчнасці. Напрыклад, у даследаванні "Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы" пачатак можа быць такім: *Праблема фарміравання самастойнасці навучэнца як яго асобаснай характарыстыкі ўваходзіць у круг першачарговых задач сучаснай педагагічнай навукі*. Далей варта прыводзіць фактары (педагагічныя, сацыяльныя, псіхалагічныя і інш.), якія вытлумачваюць, удакладняюць сфармуляваны тэзіс.

Праблему даследавання мэтазгодна фармуляваць у форме пытання, звязанага з пошукамі педагагічных умоў, якія садзейнічаюць аптымізацыі

канкрэтнай сітуацыі. Фармулёўка праблемы частотна пачынаецца са слоў: *Якія педагагічныя ўмовы прадуктыўныя/аптымальныя для ..? Пры якіх педагагічных умовах будзе ажыццяўляцца эфектыўнае/паспяховае/якаснае навучанне*? Напрыклад, у даследаванні "*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*" праблема можа гучаць так: "Якія педагагічныя ўмовы аптымальныя для фарміравання ў навучэнцаў самастойнасці праз выкарыстанне пошукавых/творчых заданняў?" або "Пры якіх педагагічных умовах у навучэнцаў I–IV класаў будзе паспяхова фарміравацца самастойнасць праз выкарыстанне нетрадыцыйных формаў працы?"

Праблема даследавання можа фармулявацца не толькі ў форме пытання, але і з дапамогай слоў *неабходнасць/мэтазгоднасць/ патрэбнасць/запатрабаванасць,* напрыклад: *праблема даследавання заключаецца* ў неабходнасці распрацоўкі педагагічных умоў, якія забяспечваюць паўнацэннае фарміраванне самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** *Аб'ект* — гэта рэальныя педагагічныя з'явы, працэсы, якія ствараюць праблемную сітуацыю. Іншымі словамі, аб'ект даследавання — гэта з'ява, у сферы якой знаходзяцца інтарэсы даследчыка, на якую накіравана навуковая дзейнасць. У якасці аб'екта ў педагагічных даследаваннях могуць выступаць наступныя працэсы:

- адукацыі/навучання/выхавання;
- адукацыйна-выхаваўчая дзейнасць;
- метадычная сістэма навучання;
- пазнавальная дзейнасць навучэнцаў.

Так, у даследаванні "*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*" *аб'ект даследавання* — працэс навучання беларускай мове малодшых школьнікаў.

Аб'ект — *лінгваметадычная сітуацыя*, якая патрабуе дэталёвага разгляду ў працы. *Некарэктна* ў якасці аб'екта называць установу адукацыі, дзіця/дзяцей, педагога/педагогаў, напрыклад, навучанне будучага настаўніка пачатковай школы ва ўмовах універсітэта.

*Прадмет даследавання* — гэта частка, аспект, пэўныя ўласцівасці, адносіны аб'екта, якія непасрэдна даследуюцца. Прадмет лагічна вынікае з праблемы даследавання. Прадметам можа быць мэтавы, зместавы, тэхналагічны, асобасны, матывацыйны, арганізацыйны аспект даследаванай з'явы або дзейнасці; педагагічныя ўмовы, фактары, прынцыпы, метады, формы, сродкі рэалізацыі пэўнага працэсу. Гэта тыя аспекты аб'екта, якія падвяргаюцца зменам у працэсе эксперыментальнага навучання.

Прадметам даследавання могуць выступаць таксама тыя кампаненты цэласнага педагагічнага працэсу, фарміраванне якіх залежыць ад настаўніка:

- фарміраванне кампетэнцый, ведаў, уменняў, навыкаў навучэнцаў;

– рэалізацыя прынцыпаў навучання і выхавання на ўроках беларускай мовы;

– эфектыўнасць прымянення пэўных метадаў і прыёмаў навучання;

– выкарыстанне арганізацыйных форм сродкаў навучання і выхавання;

– ажыццяўленне кантролю (маніторынгу) якасці, узроўняў сфарміраванасці ўменняў, навыкаў і г.д.

Так, у тэме "Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы" *прадметам даследавання* з'яўляецца методыка фарміравання самастойнасці ў малодшых школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове.

Такім чынам, аб'ет і прадмет даследавання суадносяцца паміж сабой як *агульнае і прыватнае, агульнае і частка*. Суадносіны аб'екта і прадмета можна прадэманстраваць на наступным малюнку (малюнак 1):




Малюнак 1 — Суадносіны аб'екта і прадмета
ў педагагічных даследаваннях

Круг на малюнку 1 — гэта **аб'ект**, тая цэласная з'ява, якая знаходзіцца ў цэнтры ўвагі даследчыка. Частка круга на малюнку — гэта **прадмет**, пэўны аспект цэласнай з'явы, што вылучаецца пэўнымі межамі, у якіх пралягае інтарэс даследчыка. І аб'ект, і прадмет "вырастаюць", вынікаюць з тэмы і абумоўлены ёй, фармулююцца на аснове тэмы.

У фармулёўцы аб'екта і прадмета не павінны з'яўляцца новыя паняцці, якія адсутнічаюць у тэме. Напрыклад, *вучэбны працэс* пры неабходнасці можна назваць *працэсам навучання*, аднак варта разумець: працэс навучання — гэта *элемент працэсу* фарміравання асобы, які патрабуе дапаўнення суб'екта — *навучання каго?* — малодшых школьнікаў. Пры ўжыванні паняцця *вучэбны працэс* трэба памятаць, што гэта *структурная адзінка* цэласнага педагагічнага працэсу, таму пры ўжыванні варта дадаваць назву ступені навучання (І ступень агульнай сярэдняй адукацыі).

Пры фармулёўцы прадмета даследавання трэба ўлічваць змест курсавой/дыпломнай працы і зыходзіць з таго, што можа змяняцца пры ўзаемадзеянні настаўніка і навучэнцаў, або з таго, якія аспекты педагагічнага працэсу залежаць *ад узгодненасці агульных дзеянняў* паміж настаўнікам і вучнямі з мэтай забяспечыць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу:

1) вучні будуць задзейнічаны ў адпаведнай практычнай дзейнасці;

2) у навучэнцаў будзе сфарміравана матывацыя дзейнасці;

3) навучэнцы засвояць пэўную сістэму ведаў, уменняў, навыкаў;

4) навучэнцам будзе прад'яўлена пэўная сістэма, комплекс заданняў;

5) пэўныя вучэбныя дзеянні будуць ажыццяўляцца ў сістэме;

6) будзе створана пэўнае маўленчае асяроддзе;

7) забяспечана арыентацыя адукацыйна-выхаваўчага працэсу на пэўную мэту дзейнасці, канкрэтныя каштоўнасці;

8) будзе распрацавана і рэалізавана дэталізаваная праграма, якая забяспечыць вучэбныя дасягненні;

9) у падручнікі па вучэбным прадмеце будуць уключаны пэўныя пытанні.

**Мэта даследавання** — асноўны вынік, які будзе атрыманы па завяршэнні працы. Мэта фармулюецца на аснове вызначаных праблемы, аб'екта і прадмета даследавання. Фармулёўка мэты звычайна афармляецца *праз аддзеяслоўныя назоўнікі*, напрыклад:

– *абгрунтаванне* лінгваметадычнага патэнцыялу вывучэння той ці іншай тэмы або арганізацыі працэсу навучання;

– *вызначэнне* тэарэтычных арыенціраў для распрацоўкі пэўнай методыкі, праграмы;

– *апісанне* навуковых падыходаў для распрацоўкі навукова-метадычных рэкамендацый, методык, тэхналогій;

– *выяўленне* спецыфікі працэсу або з'явы (асаблівасцей узаемадзеяння настаўніка і вучняў, дыдактычнага матэрыялу);

– *распрацоўка, мадыфікацыя, трансфармацыя* пэўнай мадэлі, методыкі, тэхналогіі ва ўмовах сучасных адукацыйных рэалій;

– *аналіз* зместу і структуры пэўнай з'явы (напрыклад, змест і структура моўнай, маўленча-камунікатыўнай кампетэнцый).

Напрыклад, *мэта даследавання* — тэарэтычнае абгрунтаванне і эмпірычнае пацвярджэнне развіццёвага патэнцыялу дыдактычных гульняў у працэсе навучання беларускай мове ў 1-м класе.

Мэта даследавання выяўляе, што аўтар хоча даказаць, патлумачыць, прадэманстраваць у сваёй працы. Як правіла, мэта даследавання фармулюецца праз наступныя дзеянні:

1) *выяўленне, вызначэнне, распрацоўка*;

2) *вытлумачэнне, дэманстрацыя, устанаўленне, інтэрпрэтацыя, абгрунтаванне, апісанне*;

3) *эксперыментальная праверка, апрабацыя, рэалізацыя, укараненне…*

Пры фармулёўцы мэты з кожнай групы пералічаных дзеянняў (*навуковых, тэарэтычных, практычных*) трэба выбраць тыя, якія суадносяцца з тэмай/аб'ектам/прадметам даследавання. Напрыклад, у курсавой "*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*" мэта даследавання можа быць сфармулявана наступным чынам:

Варыянт 1: *выяўленне, абгрунтаванне і рэалізацыя* педагагічных умоў фарміравання самастойнасці ў малодшых школьнікаў праз выкарыстанне сістэмы дыдактычных гульняў.

Варыянт 2: *вызначэнне, апісанне і эксперыментальная праверка* педагагічных умоў фарміравання самастойнасці ў малодшых школьнікаў праз выкарыстанне сістэмы творчых заданняў.

Зазначым: пасля слоў *мэта даследавання*, як правіла, ставіцца *не дэфіс*, а *працяжнік* (–). Калі ў фармулёўцы мэты даследавання выкарыстоўваецца дзеяслоў (напрыклад, мэта даследавання *заключаецца ў* (*з'яўляецца, уяўляе сабой, характарызуецца, абумоўліваецца…*), то працяжнік, зразумела, не ставіцца.

**Задачы даследавання** — асноўныя вынікі тых дзеянняў, якія плануюцца ў змесце працы. Задачы канкрэтызуюць мэту даследавання і падзяляюцца на паслядоўныя этапы/ступенькі — дзеянні даследчыка, якія забяспечваюць вынікі працы — аналіз літаратуры, параўнанне тэарэтычных падыходаў, збор эмпірычных дадзеных і г.д. Задачы — тыя аспекты, для дасягнення якіх даследчык выконвае пэўныя дзеянні на кожным этапе даследавання. Задачы фармулююцца, як правіла, з дапамогай *дзеясловаў законачанага трывання*: *вызначыць, раскрыць, абгрунтаваць, прааналізаваць, устанавіць, распрацаваць, апрабаваць, ацаніць выніковасць, абагульніць, праверыць эфектыўнасць прапанаваных ідэй* і г.д. Напрыклад:

1) *раскрыць змест вядучых паняццяў* курсавой/дыпломнай працы;

2) *вызначыць і абгрунтаваць* тэарэтычныя падыходы;

3) *выявіць зыходны ўзровень* ведаў і ўменняў навучэнцаў;

4) *распрацаваць сістэму заданняў*/практычныя рэкамендацыі;

5) *абагульніць вынікі* вопытна-эксперыментальнай працы і інш.

Фармулёўкі задач дэталізуюць, канкрэтызуць мэту, іх дасягненне і вырашэнне складае змест падраздзелаў работы. Гэта важны аспект і па той прычыне, што назвы раздзелаў/падраздзелаў сутнасна адпавядаюць фармулёўкам задач даследавання. Задачы працы могуць фармулявацца з выкарыстаннем наступных маўленчых формул:

– *вызначыць* вядучыя параметры з'явы/працэсу…

– *выявіць* дыдактычны эфект распрацаванай методыкі…

– *устанавіць* заканамернасці…

– *назваць фактары*, якія прадвызначаюць аптымальны ўзровень/стан...

– *ахарактарызаваць…*
– *выдзеліць* разнавіднасці, тыпы, класіфікацыі…
– *прааналізаваць* вопыт, *ацаніць* прапановы…
– *сфармуляваць* праблемы і перспектывы развіцця…;
– *даць (прывесці)* агульную характарыстыку…;
– *распрацаваць* план рэалізацыі…

Трэба зазначыць, што паслядоўнасць задач мае ўласную логіку. Так, *першая задача* звычайна заключаецца ў тым, каб выявіць (удакладніць, паглыбіць, абгрунтаваць ступень распрацаванасці праблемы даследавання ў педагагічнай тэорыі і практыцы). Яна можа быць сфармулявана наступнымі спосабамі: 1) устанавіць ступень распрацаванасці праблемы ў педагагічнай тэорыі і практыцы; 2) вывучыць педагагічную, псіхолага-педагагічную, лінгваметадычную літаратуру па праблеме.

*Другая задача,* як правіла, прысвечана аналізу рэальнага стану прадмета даследавання, раскрывае дынаміку, трансфармацыі аб'екта. Другая задача можа быць сфармулявана наступным чынам: 1) раскрыць (удакладніць, дапоўніць) ключавыя паняцці даследавання; 2) даць разгорнутую характарыстыку прадмета даследавання; 3) ажыццявіць лінгваметадычны аналіз ключавых паняццяў курсавой/дыпломнай працы.

*Трэцяя задача* абумоўлена мэтай, таму прадпісваюцца дзеянні, якія плануе ажыццявіць даследчык, каб яе вырашыць, напрыклад: 1) распрацаваць і эксперыментальна праверыць педагагічныя ўмовы, звязаныя з прадметам даследавання, з запланаванымі вынікамі; 2) спраектаваць педагагічныя ўмовы, абумоўленыя прадметам даследавання, і прадэманстраваць (паказаць, апісаць, раскрыць) працэс іх рэалізацыі на ўроках беларускай мовы.

*Чацвёртая задача* звязана з распрацоўкай крытэрыяў ацэнкі ўзроўняў развіцця/фарміравання ўменняў/якасцей, якія плануюцца дасягнуць у даследаванні, з распрацоўкай/падборам методык, з дапамогай якіх выяўляецца/замяраецца ўзровень атрыманых практычных вынікаў.

Падбор або распрацоўку дыягнастычнага інструментарыю (методыкі, інструменты ацэньвання) для выяўлення эфектыўнасці вынікаў даследавання *можна аформіць як асобную задачу*. <u>Варыянт 1</u>: падабраць методыкі ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў. <u>Варыянт 2:</u> распрацаваць крытэрыі, паказчыкі, узроўні ацэнкі сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў. <u>Варыянт 3</u>: падабраць дыягнастычныя методыкі, якія забяспечваюць выяўленне і аб'ектыўную ацэнку ўзроўню сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў.

*Пятая задача* можа быць звязана з распрацоўкай дыдактычных матэрыялаў для навучэнцаў (сістэмы дыдактычных заданняў, комплексу гульняў, шэрагу сцэнарыяў мерапрыемстваў, праграм і інш.) або метадычных матэрыялаў для настаўніка (метадычныя рэкамендацыі па прымяненні прынцыпаў/метадаў; метадычныя рэкамендацыі для працы з бацькамі і г.д.).

Так, у даследаванні “Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы” *задачы* могуць быць сфармуляваны наступным чынам:

1) *вывучыць* педагагічна-псіхалагічную літаратуру па праблеме фарміравання самастойнасці ў малодшых школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове;

2) *даць разгорнутую характарыстыку* самастойнасці як якасці асобы малодшага школьніка/*ахарактарызаваць асаблівасці* праяўлення самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў;

3) *раскрыць сутнасць методыкі* фарміравання самастойнай дзейнасці навучэнцаў і асаблівасці яе праяўлення ў пачатковай школе;

4) *распрацаваць крытэрыі* ўзроўняў сфарміраванасці самастойнасці навучэнцаў праз сістэму заданняў;

5) *рэалізаваць на практыцы і ўстанавіць эфектыўнасць* педагагічных умоў фарміравання самастойнасці ў малодшых школьнікаў праз сістэму заданняў.

Звернем увагу на пастаноўку знакаў прыпынку пры фармулёўцы задач:

1) усе задачы нумаруюцца;
2) пасля парадкавага нумара ставіцца дужка (1); 2); 3)…);
3) кропка пасля дужкі не ставіцца;
4) першае слова ў фармулёўцы задачы пішацца з малой літары;
5) у канцы пасля фармулёўкі кожнай задачы ставіцца кропка з коскай;
6) пасля фармулёўкі апошняй задачы ставіцца кропка.

**Фармулёўка метадаў даследавання.** Пад метадамі педагагічнага даследавання разумеюцца “спосабы вывучэння педагагічных з’яў, назапашвання навуковай інфармацыі з мэтай устанавіць заканамерныя сувязі і структуру навуковай тэорыі. Для кожнага этапу даследавання вызначаецца аптымальны комплекс метадаў і іх спалучэння”[2], што дазваляе атрымаць рознабаковыя сістэмныя звесткі па тэме курсавой/дыпломнай.

Традыцыйна метады даследавання класіфікуюцца на:

– *тэарэтычныя*: тэарэтычны аналіз, абстрагаванне, аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, абагульненне, мадэляванне, класіфікацыя і інш.;

– *эмпірычныя*: назіранне, анкетаванне, аналіз прадуктаў пазнавальнай дзейнасці — пісьмовых прац навучэнцаў, дадзеных педагагічнага эксперымента;

– *метады апрацоўкі дадзеных*: *якасныя* (інтэрпрэтацыя вынікаў эксперымента) і *колькасныя* (метады матэматычнай статыстыкі). Прымяняюцца для апрацоўкі звестак, атрыманых з выкарыстаннем анкетавання і педагагічнага эксперымента, для ўстанаўлення залежнасці паміж даследаванымі з’явамі.

---

[2] Сластенин, В.А. Педагогика: учебное пособие / В.А. Сластенин, И.Ф. Исаев, Е.Н. Шиянов. — М.: Академия, 2016. — 543 с.

Выбар метадаў адбываецца з улікам спецыфікі аб’екта і прадмета даследавання. Канкрэтныя методыкі (прынцыпы, метады, прыёмы, сродкі) прадвызначаюцца сфармуляванымі задачамі і ўмовамі правядзення даследавання і апісваюцца ў другой эмпірычнай главе.

Метады тэарэтычнага ўзроўню неабходны для вызначэння праблемы і навуковай базы даследавання: *тэарэтычны аналіз* — выдзяленне і разгляд асобных аспектаў, прымет, асаблівасцей, уласцівасцей педагагічных з’яў. *Аналіз* суправаджаецца *сінтэзам* і дазваляе спазнаць сутнасць даследаваных педагагічных з’яў. *Індуктыўныя і дэдуктыўныя метады* — лагічныя метады абагульнення дадзеных, атрыманых эмпірычным шляхам. Індуктыўны метад мае на ўвазе фармулёўку ад прыватных назіранняў да агульных. Дэдуктыўны — ад агульных меркаванняў да прыватных вывадаў.

*Мадэляванне* (ад лац. modus — узор) — даследаванне пэўных аб’ектаў (канкрэтных і абстрактных) на аснове мадэлей. Мадэль — штучна створаны аб’ект даследавання ў выглядзе схемы, канструкцыі, формулы, што выступаюць аналагам даследаванага аб’екта, адлюстроўвае і ўзнаўляе структуру, уласцівасці, узаемасувязі і адносіны паміж кампанентамі даследаванага аб’екта[3].

Для канкрэтнага даследавання вызначаецца комплекс метадаў, адэкватных сфармуляваным задачам. Так, у працы “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*” могуць быць выкарыстаны наступныя метады: тэарэтычны аналіз, параўнанне пазіцый розных вучоных, абагульненне, назіранне, вывучэнне пісьмовых работ навучэнцаў, педагагічны эксперымент, выкарыстанне табліц, дыяграм, схем. Сукупнасць метадаў прадстаўлена ў табліцы 3:

Табліца 3 — Метады педагагічнага даследавання

| Тэарэтычныя метады | Эмпірычныя метады | Метады апрацоўкі дадзеных |
|---|---|---|
| Тэарэтычны аналіз/сінтэз, параўнанне пазіцый розных даследчыкаў, абагульненне, абстрагаванне, канкрэтызацыя, сістэматызацыя, класіфікацыя, індуктыўны і дэдуктыўны метады, аперацыі з вядучымі паняццямі, мадэляванне | Назіранне, дыягнастычныя метады (анкетаванне, тэсціраванне, метад экспертных ацэнак), аналіз прадуктаў пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, аналіз пісьмовых прац, педагагічны эксперымент (канстатуючы, навучальны, кантрольны) | Метады першаснай апрацоўкі дадзеных (рэгістрацыя, статыстычныя падлікі), метады нагляднага прадстаўлення вынікаў (табліцы, графікі, дыяграмы, схемы) |

[3]Сластенин, В.А. Педагогика: учебное пособие / В.А. Сластенин, И.Ф. Исаев, Е.Н. Шиянов. — М.: Академия, 2016. — 543 с.

**Эксперыментальная база даследавання** — тая ўстанова, ва ўмовах якой праводзіцца эксперыментальнае навучанне. Звычайна інфармацыя пра базу даследавання фармулюецца так: *Практычнае даследаванне праводзілася на базе ўстановы адукацыі… У эксперыменце ўдзельнічалі навучэнцы 2А і 2Б класаў названай установы. У даследаванні прымалі ўдзел 24 навучэнцы.*

**Тэарэтычная значнасць** — гэта сукупнасць найноўшых ідэй у кантэксце даследавання. Нават фармат курсавой працы прадугледжвае, што аўтар сфармулюе элементы навізны, якімі адрозніваецца праца ў параўнанні з папярэднімі. Адсутнасць фармулёўкі тэарэтычнай значнасці ставіць пад сумненне мэтазгоднасць праведзенага даследавання. Для студэнцкай працы тэарэтычная значнасць можа быць аформлена як *выкарыстанне нетрадыцыйных формаў, прыёмаў, сродкаў* у кантэксце заяўленай праблемы, *аўтарская інтэрпрэтацыя ідэй вучоных*. Тэарэтычная значнасць можа канкрэтызавацца як адказ на пытанне: *што новага вы даведаліся па гэтай тэме*? Адказ у пэўнай ступені будзе характарызаваць навізну прадмета даследавання. Безумоўна, фармулёўка навізны складае найбольшую цяжкасць пры афармленні студэнцкага даследавання. Навуковая каштоўнасць дыпломнай можа заключацца ў спасціжэнні асаблівасцей, спецыфікі з’явы, пэўных заканамернасцей, механізмаў узаемадзеяння паміж суб’ектамі адукацыйнага працэсу.

*Фармулёўка тэарэтычнай значнасці* студэнцкіх даследаванняў можа заключацца:

– ва ўдакладненні, канкрэтызацыі зместу ключавых паняццяў;
– у распрацоўцы комплексу педагагічных умоў;
– у мадэляванні (пабудове мадэлі) пэўнага педагагічнага працэсу;
– у выкарыстанні метадычных сродкаў пры вывучэнні пэўнай тэмы.

Так, у даследаванні “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*” тэарэтычная значнасць можа заключацца ў: 1) вызначэнні асаблівасцей праяўлення самастойнасці навучэнцаў I–IV класаў у сучаснай гарадской/сельскай установе адукацыі; 2) распрацоўцы крытэрыяў, паказчыкаў для выяўлення ўзроўню сфарміраванасці самастойнасці малодшых школьнікаў.

**Практычная значнасць** уяўляе сабой канкрэтнае пацвярджэнне вынікаў даследавання, іх прыкладно'й каштоўнасці. Практычная значнасць можа заключацца ў распрацоўцы дыдактычных матэрыялаў (заданняў, гульняў, канспектаў урокаў, сцэнарыяў выхаваўчых мерапрыемстваў і т.п.), а таксама ў выкарыстанні пэўных інавацыйных метадаў, сродкаў, формаў працы або ў іх арыгінальным спалучэнні, нестандартным прымяненні. У даследаванні “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*” практычная значнасць можа заключацца ў стварэнні дыдактычных матэрыялаў, якія забяспечваюць

эфектыўнае фарміраванне самастойнасці малодшых школьнікаў. Практычная значнасць раскрываецца праз метады і сродкі, методыку ўдасканалення вывучэння пэўнай тэмы.

Практычная значнасць пацвярджаецца выступленнямі на навукова-практычных студэнцкіх канферэнцыях, пасяджэннях педагагічных саветаў, вучэбна-метадычных аб’яднаннях настаўнікаў пачатковых класаў, праз укараненне ў практыку ўстаноў адукацыі элементаў педагагічных тэхналогій, інтэрактыўных формаў і метадаў навучання і выхавання падчас педагагічнай практыкі студэнтаў, праз выкарыстанне метадычных рэкамендацый у вучэбным працэсе. Практычная значнасць падмацоўваецца актам/актамі ўкаранення вынікаў працы ў адукацыйны працэс.

*Апрабацыя вынікаў даследавання* — гэта вопыт прэзентацыі, абароны і выкарыстання асноўных ідэй і высноў праз:

– навукова-метадычныя публікацыі па тэме (артыкулы, тэзісы);

– выступленні на навукова-практычных студэнцкіх канференцыях;

– удзел у прафесійна-метадычных конкурсах, праектах, семінарах, мерапрыемствах;

– выкарыстанне вынікаў даследавання падчас педагагічнай практыкі.

**Структура працы** вызначаецца логікай арганізацыі і размяшчэння элементаў у пэўным парадку: тытульны ліст, змест, уводзіны, асноўная частка, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадатак. Як вядома, асноўную частку працы складаюць ***тэарэтычная*** і ***эмпірычная*** главы даследавання. Пры фармулёўцы глаў (раздзелаў) і падраздзелаў варта карыстацца пераважна тымі тэрмінамі, якія задзейнічаны ў назве тэмы/праблемы даследавання.

*Назва першай главы* абумоўлена тэмай (але не паўтарае даслоўна яе фармулёўку), раскрывае найперш тэарэтычны характар прадстаўленага матэрыялу. Напрыклад, для тэмы “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*” назва главы можа быць сфармулявана наступным чынам. <u>Варыянт 1</u>: Фарміраванне самастойнай дзейнасці малодшых школьнікаў як педагагічная (псіхолага-педагагічная) праблема. <u>Варыянт 2</u>: Тэарэтычнае абгрунтаванне праблемы фарміравання самастойнасці ў навучэнцаў I–IV класаў у кантэксце вывучэння беларускай мовы.

*Тэарэтычная глава* курсавой/дыпломнай працы, яе фармулёўка павінна канкрэтызаваць тэму і тэарэтычны аспект праблемы даследавання. Частотна яе назва фармулюецца наступным чынам: *Тэарэтычныя аспекты вывучэння...; Феномен... у педагагічнай літаратуры; Вывучэнне праблемы... у працах айчынных і замежных даследчыкаў…*

*Тэарэтычная глава* — гэта навуковы, метадалагічны фундамент даследавання. Глава ў ідэале ўяўляе сабой не проста канстатацыю, апісанне навуковых падыходаў, а іх аналіз, супастаўленне, ацэнку з пазіцыі ўласнага варыянта вырашэння праблемы. Глава раскрывае асноўныя *навуковыя*

*падыходы* (базісная катэгорыя методыкі, якая вызначае стратэгію навучання мове і выбар метадаў навучання — сістэмна-дзейнаснага, культуралагічнага, асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага), *канцэпцыі* (сістэма поглядаў на тэорыю і тэхналогію навучання), *прынцыпы, ідэі, фактары, умовы, ключавыя паняцці* і іх каментарый. Вядучыя паняцці павінны ўжывацца ў змесце працы ў значэнні, прапанаваным аўтарам даследавання, са спасылкамі на слоўнікі метадычных тэрмінаў, работы аўтарытэтных вучоных. Логіка афармлення тэксту тэарэтычнай главы можа будавацца як:

– пераход ад разгляду агульных праблем да апісання канкрэтных аспектаў даследавання;

– храналагічны агляд даследаванняў з апісаннем гісторыі вывучэння праблемы — паводле пэўных перыядаў/этапаў развіцця, змены даследчых ідэй, парадыгмаў. Напрыклад, прафесар М.Г. Яленскі, раскрываючы сутнасць лінгваметодыкі як навукі, вылучае наступныя гістарычныя этапы развіцця айчыннай методыкі як навукі і адукацыйнай практыкі:

1) *перыяд станаўлення моўнай адукацыйнай практыкі і лінгваметодыкі* (1920–1930 гады), які характарызуецца выданнем першых школьных падручнікаў па беларускай мове, вучэбных праграм, метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў. Змест моўнай адукацыі і методыка навучання ў гэты час грунтуюцца на *фармальна-граматычным падыходзе*;

2) *перыяд развіцця савецкай сістэмы моўнай адукацыі і лінгваметодыкі* (1940–1980 гады) вызначаецца ўдасканаленнем моўнай адукацыі на аснове новых вучэбных праграм, стабільных падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, выданнем першых дапаможнікаў па лінгваметодыцы для студэнтаў ВНУ, манаграфій. Навучанне мове ў гэтым перыядзе грунтавалася на аснове *сістэмна-апісальнага падыходу*;

3) *найноўшы перыяд развіцця моўнай адукацыі і лінгваметодыкі* ў Рэспубліцы Беларусь (канец XX — першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя) вылучаецца распрацоўкай канцэпцый моўнай адукацыі, адукацыйных стандартаў, нормаў ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў. Навучанне мове ў гэты час грунтуецца на аснове *сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага, асобасна арыентаванага і кампетэнтнаснага падыходаў*[4].

Логіка афармлення тэксту тэарэтычнай главы заснавана на выяўленні падабенства і асаблівасцей розных падыходаў, навуковых школ, ідэй аўтарытэтных даследчыкаў, на рознааспектным аналізе манаграфій, аўтарэфератаў, дапаможнікаў па методыцы выкладання мовы. Выкананне працы падразумявае веданне работ айчынных метадыстаў, у якіх

---

[4]Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. — Мінск: Вышэйшая школа, 2020. — 263 с. — С. 4–8.

вызначаны канцэптуальныя асновы сучаснай моўнай адукацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, распрацавана навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу з улікам выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў, сучасных электронных адукацыйных рэсурсаў, нацыянальнай сістэмы ацэнкі адукацыйных дасягненняў навучэнцаў, правядзенне даследавання якасці адукацыі на аснове вынікаў PISA (Н.М. Антановіч, Н.У. Антонава, І.А. Буторына, Г.М. Валочка, А.А. Гулецкая, В.У. Зелянко, Я.М. Лаўрэль, В.У. Протчанка, В.Ф. Русецкі, В.І. Свірыдзенка, Л.П. Падгайскі, І.І. Паўлоўскі, В.І. Цірынава, А.П. Шанько, Т.М. Шылько, М.Г. Яленскі і інш.).

Тэарэтычная глава — складаны кампанент курсавой/дыпломнай працы, які патрабуе ўдумлівага знаёмства са значнай колькасцю навуковых даследаванняў. Складанасць заключаецца ў фіксацыі, сістэматызацыі розных падыходаў да асвятлення праблемы. Падрыхтоўка да **агляду літаратуры** прадугледжвае наступныя этапы:

– падбор базавай мадэлі для самага агульнага ўяўлення пра ключавыя аспекты выбранай тэмы. Гэта можа быць адпаведны раздзел падручніка/вучэбнага дапаможніка па методыцы выкладання беларускай/рускай мовы. З мэтай пошуку базавай мадэлі варта прагледзець як айчынныя так і расійскія выданні, прызначаныя для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў;

– студэнт першапачаткова знаёміцца з рэкамендаваным спісам літаратуры, які прыводзіцца ў адпаведных раздзелах базавых падручнікаў па методыцы. Знаёмства адбываецца як з асноўнай, так і з дадатковай літаратурай па тэме, што выступае першасным этапам асэнсавання меж і напрамку ўласнага даследавання;

– паглыбленне ўяўлення аб праблеме даследавання ажыццяўляецца праз дэталёвае чытанне манаграфій, аўтарэфератаў, навуковых артыкулаў па тэме з вылучэннем ключавых ідэй, дыскусійных момантаў, з выдзяленнем галоўнага зместу прачытаных і прааналізаваных крыніц;

– падчас агляду мэтазгодна вызначыцца з часам датавання публікацый. Павінны быць прааналізаваны працы, якія асвятляюць гістарычны экскурс праблемы. Для паўнацэннага даследавання ў цэнтры ўвагі павінны быць і канцэптуальныя сучасныя падыходы (публікацыі за апошніх 5–10 гадоў), якія фарміруюць бачанне сучасных навуковых дасягненняў;

– пошук літаратуры павінен весціся на аснове сціслай фармулёўкі праблемы, а таксама праз ключавыя словы даследавання;

– асобным аспектам аналізу павінны быць інтэрнэт-крыніцы, рэпазіторыі вядучых устаноў адукацыі, найперш ВДУ імя П.М. Машэрава.

Разрозненыя матэрыялы не замяняюць сур'ёзныя навуковыя даследаванні, аднак яны могуць быць выкарыстаны для запазычвання

(з абавязковай спасылкай на канкрэтных аўтараў, іх публікацыі) з мэтай выяўлення найноўшых аспектаў ідэй уласнага даследавання, прымяняцца ў якасці дадатковых крыніц інфармацыі для крышталізацыі асабістай пазіцыі, аўтарскага погляду на праблему.

Пасля асэнсавання напрацовак па праблеме даследавання трэба сістэматызаваць, класіфікаваць адабраныя матэрыялы. Істотна, каб публікацыі адлюстроўвалі разнажанравую літаратуру: актуальныя афіцыйныя дакументы адукацыйнай сферы, прынятыя ў Рэспубліцы Беларусь, манаграфіі, аўтарэфераты дысертацыйных даследаванняў, праведзеных у Рэспубліцы Беларусь і замежжы, бібліятэчныя рэсурсы, пошукавыя сістэмы інтэрнэту і інш. Аб'ём крыніц для агляду літаратуры павінен задавальняць наступным патрабаванням: 1) уключаць выданні як тэарэтычнага, так і практычнага (прыкладно'га, эмпірычнага) характару; 2) утрымліваць айчынныя і замежныя даследаванні; 3) адлюстроўваць сістэмныя працы, публікацыі аўтарытэтных вучоных, якія з'яўляюцца экспертамі, прафесіяналамі ў галіне лінгваметодыкі. Прынцыповымі для паспяховага агляду літаратуры з'яўляюцца наступныя моманты:

– гаворка павінна ісці пра цэласны падыход да аб'екта і прадмета даследавання, які асвятляе розныя аспекты даследаванай з'явы, выяўляе разнастайныя пазіцыі вучоных;

– рэтраспектыўны аналіз публікацый забяспечвае веданне эвалюцыі паняцця і дэманструе трансфармацыі прадмета даследавання;

– мэтазгодна пазбягаць аднабаковага аналізу прац, варта ўлічваць разнастайныя, часам супярэчлівыя погляды на праблему.

Параўнаць погляды розных аўтараў, выпрацаваць уласную пазіцыю можна толькі праз уважлівае прачытанне "чужых" навуковых тэкстаў, супастаўленне пазіцый аўтараў пад вуглом уласнага бачання праблемы.

Глыбіня разумення навуковага тэксту дасягаецца пры ўмове захавання *правіл эфектыўнага чытання:*

– свядомая фармулёўка мэты чытання;
– асэнсаванае знаёмства з інфармацыяй;
– фіксаванне інфармацыі з мэтай сістэматызацыі і абагульнення;
– мэтанакіраваны адбор інфармацыі для ўласнага даследавання.

Падчас чытання рацыянальна знаходзіць сутнаснае ў разважаннях розных аўтараў, усведамляць, чым адрозніваюцца пазіцыі вучоных, у якой паслядоўнасці падаюцца факты, адзначаць агульныя пункты для сістэматызацыі ідэй і выпрацоўкі стратэгіі ўласнай дзейнасці.

Пры чытанні любой працы варта гіпатэтычна адказваць на наступныя пытанні: 1. Якія думкі артыкула/працы здаюцца найбольш доказнымі? Якія палажэнні ўспрымаюцца спрэчнымі і чаму? Ці дастаткова доказаў прыведзена аўтарам у абарону і падтрымку ўласнага пункту погляду? 2. З якімі думкамі/палажэннямі я не згодны/згодны? Па якой прычыне?

*Тыповымі памылкамі пры аглядзе літаратуры* з’яўляюцца:

– апісальны, канстатуючы характар тэарэтычнай главы, які атаясамліваецца з канспектам чужых даследаванняў;

– пераўтварэнне аналізу літаратуры ў самамэту, у аналіз “пад прымусам” патрабаванняў;

– бессістэмнасць у аналізе, адсутнасць абагульненняў і лагічнай паслядоўнасці;

– некрытычнае выкарыстанне літаратуры, няўменне вызначыць яе навуковую каштоўнасць;

– скажэнне аўтарскай думкі, суб’ектыўнае разуменне і цытаванне матэрыялу;

– прамое запазычванне чужых тэкстаў.

*Другая глава* мае эмпірычны, вопытна-эксперыментальны характар. Фармулёўка назвы главы адлюстроўвае не толькі яе змест, але і практычны характар даследавання.

У працах эмпірычнага характару назва другой главы павінна акрэсліваць методыку працы з эксперыментальным матэрыялам. Так, у даследаванні “*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў класаў на ўроках беларускай мовы*” назва другой главы можа фармулявацца наступным чынам:

<u>Варыянт 1</u>: Арганізацыя эксперыментальнай працы па фарміраванні самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў.

<u>Варыянт 2</u>: Практыка фарміравання самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў.

<u>Варыянт 3</u>: Практычная работа па фарміраванні самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў.

Для пастаноўкі задач вопытна-эксперыментальнай працы могуць выкарыстоўвацца наступныя фармулёўкі:

– *выявіць зыходны ўзровень* сфарміраванасці ў навучэнцаў даследаванай якасці на аснове вылучаных паказчыкаў;

– *раскрыць патэнцыял* адукацыйнага працэсу для рэалізацыі праграмы вопытнага навучання;

– *зафіксаваць узровень* сфарміраванасці ў навучэнцаў ведаў, уменняў і навыкаў у кантэксце даследаванай праблемы;

– *прааналізаваць колькасныя і якасныя вынікі* вопытна-эксперыментальнай працы;

– *зрабіць вывады* аб эфектыўнасці эксперыментальнай работы.

У курсавой працы вопытна-эксперыментальнага характару ў другой главе паслядоўна апісваецца эксперымент, які праводзіцца з мэтай апрабацыі тэарэтычных палажэнняў, разгорнутых у першай частцы работы. Вопытна-эксперыментальная праца падразумявае:

– *канстатуючы эксперымент*: вызначэнне зыходнага ўзроўню ведаў, уменняў, навыкаў навучэнцаў у рэчышчы даследаванай праблемы;

– *навучальны эксперымент*: мэтанакіраванае ўздзеянне падчас правядзення эксперыментальнай работы;

– *кантрольны эксперымент*: супастаўленне вынікаў навучэнцаў у эксперыментальнай і кантрольнай групах.

*Эксперыментальная группа* — тая, у якой рэалізуюцца інавацыйныя рашэнні (прапануецца аўтарская праграма, сістэма заданняў, сукупнасць метадычных сродкаў і інш.).

*Кантрольная група* — тая, у якой дыдактычныя задачы рэалізуюцца ў рамках традыцыйнага навучання.




Вопытна-эксперыментальная праца праводзіцца ў тры этапы:

– *на першым этапе* канстатуючы эксперымент скіроўваецца на выяўленне зыходнага стану даследаванага аб’екта. На гэтым этапе праводзіцца параўнальны аналіз першасных вынікаў эксперыментальнай і кантрольнай груп па вызначаных паказчыках. Для гэтага вынікі кожнага вучня афармляюцца ў зводную табліцу, якая вызначае ўзровень сфарміраванасці пэўнай якасці (табліца 4).

Табліца 4 — Зводная табліца для ацэнкі ўзроўняў сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў эксперыментальнай групы (канстатуючы этап эксперымента)

| № | Прозвішча, імя навучэнца | Паказчыкі ўзроўню | | | Сума балаў | Узровень |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Аляксееў Аляксей | 2 | 1 | 1 | 4 | Сярэдні |
| 2. | Барынава Наталля | 3 | 2 | 2 | 7 | Высокі |
| 3. | Васільева Ганна | 0 | 1 | 1 | 2 | Нізкі |

Як сведчыць практыка, у вопытна-эксперыментальных даследаваннях мэтазгодна выдзяляць тры ўзроўні дыягнаставанай з’явы і ацэньваць кожны паказчык, напрыклад: *на высокім узроўні — 2 баламі; на сярэднім — 1 балам; на нізкім — 0 балаў* (табліца 5).

Табліца 5 — Ацэнка ўзроўню сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў паводле крытэрыяў і паказчыкаў

| **Крытэрый** | **Веды пра спосабы дзейнасці** |
|---|---|
| **Паказчык** | **Паўната ведаў пра спосабы дзейнасці** |
| Высокі ўзровень | 2 |
| Сярэдні ўзровень | 1 |
| Нізкі ўзровень | 0 |

| | |
|---|---|
| **Крытэрый** | **Уменне прымяняць веды праз спосабы дзейнасці** |
| **Паказчык** | **Паўната ўмення прымяняць усе вядомыя спосабы дзейнасці** |
| Высокі ўзровень | 2 |
| Сярэдні ўзровень | 1 |
| Нізкі ўзровень | 0 |
| **Крытэрый** | **Матывацыйная ўстаноўка навучэнца** |
| **Паказчык** | **Жаданне самастойна дзейнічаць** |
| Высокі ўзровень | 2 |
| Сярэдні ўзровень | 1 |
| Нізкі ўзровень | 0 |

*На другім этапе* ажыццяўляецца навучальны эксперымент, мэта якога заключаецца ва ўздзеянні на эксперыментальную групу, у якой рэалізуецца распрацаваная праграма. Змест эксперымента складаюць прапанаваныя студэнтам заданні, практыкаванні, інтэрактыўныя формы працы. Мэта навучальных заданняў — рэалізацыя метадаў, прыёмаў, педагагічных умоў і інш. На гэтым этапе ўстанаўліваюцца крытэрыі і паказчыкі, што характарызуюць узровень (звычайна *высокі, сярэдні* і *нізкі*) сфарміраванасці пэўных ведаў, уменняў, навыкаў навучэнцаў. Так, да тэмы "*Фарміраванне навыкаў самастойнай дзейнасці навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*" можа быць прапанаваны наступны метадычны інструментарый (табліца 6).

Табліца 6 — Крытэрыі, паказчыкі і ўзроўні сфарміраванасці самастойнасці ў навучэнцаў малодшых класаў

| Крытэрыі | Паказчыкі | Узроўні | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Высокі | Сярэдні | Нізкі |
| Веды пра спосабы дзейнасці | Паўната ведаў пра спосабы дзейнасці | Аб'ём ведаў пра спосабы дзейнасці поўны, дастатковы | Аб'ём ведаў пра спосабы дзейнасці характарызуецца фрагментарнасцю | Аб'ём ведаў пра спосабы ведаў недастатковы, сфарміраваны эпізадычныя веды |
| Уменне прымяняць веды пра спосабы дзейнасці | Паўната ўменняў прымяняць усе вядомыя спосабы дзейнасці | Пералік уменняў поўны, дастатковы | Пералік уменняў складае палову з таго, што павінна быць у актыўным запасе навучэнцаў | Пералік уменняў складае прыкладна 15% з таго аб'ёму, які прымяняе навучэнец |

*На трэцім* — кантрольным — *этапе* працы паўторна правяраецца стан даследаванага аб’екта пасля правядзення навучальнага эксперымента. Параўноўваюцца вынікі навучэнцаў эксперыментальнай і кантрольнай груп паводле тых жа крытэрыяў і паказчыкаў. Вынікі кожнага навучэнца зноў афармляюцца ў табліцу для вызначэння ўзроўню і розніцы паміж паказчыкамі канстатуючага і кантрольнага этапу эксперымента. Аналізуюцца і апрацоўваюцца дадзеныя, правяраюцца выніковасць, эфектыўнасць распрацаванага комплексу педагагічных умоў, метадаў, прыёмаў у працэсе навучальнага эксперыменту (табліца 7).

Табліца 7 — Дынаміка эфектыўнасці сфарміраванасці самастойнасці навучэнцаў I–IV класаў

| Узроўні | У пачатку вопытна-эксперыментальнай працы | | | | У канцы вопытна-эксперыментальнай працы | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Эксперыментальная група | | Кантрольная група | | Эксперыментальная група | | Кантрольная група | |
| | Колькасць навучэнцаў | % | Колькасць навучэнцаў | % | Колькасць навучэнцаў | % | Колькасць навучэнцаў | % |
| Высокі | 2 | 10 | 1 | 5 | 7 | 35 | 3 | 15 |
| Сярэдні | 4 | 20 | 6 | 30 | 9 | 45 | 8 | 40 |
| Нізкі | 14 | 70 | 13 | 65 | 4 | 20 | 9 | 45 |

Апісанне вопытна-эксперыментальнай працы завяршаецца аналізам вынікаў, што афармляюцца з дапамогай тэксту, табліц, дыяграм, у якіх наглядна адлюстроўваецца дынаміка даследаванага працэсу.

**Дадатак.** У дадатку могуць размяшчацца распрацаваныя аўтарам матэрыялы, якія выкарыстоўваліся або могуць выкарыстоўвацца пры рэалізацыі педагагічных умоў, абазначаных у даследаванні:

– дыягнастычныя методыкі;
– дыдактычныя матэрыялы (праекты, заданні, задачы, практыкаванні і інш.);
– планы-канспекты ўрокаў;
– сцэнарыі выхаваўчых мерапрыемстваў;
– раздатачныя матэрыялы (карткі, рабочыя лісты і т.п.);
– метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў;
– метадычныя рэкамендацыі для бацькоў;
– матэрыялы анкет, тэстаў, гутарак;
– узоры наглядных дапаможнікаў;
– пісьмовыя працы навучэнцаў;
– фотаздымкі, дзіцячыя малюнкі і іншыя матэрыялы.

Усе матэрыялы дадатку павінны, па-першае, суправаджацца назвай; па-другое, мець метадычнае вытлумачэнне — якая мэта і задачы іх прымянення.

Пры складанні дадатку варта кіравацца наступнымі правіламі:

1. Нумарацыя старонак з дадаткам павінна быць скразной. Пры гэтым старонкі дадатку не ўваходзяць у вызначаны аб'ём даследавання.

2. Чарговасць у размяшчэнні дадаткаў павінна адпавядаць парадку спасылак на іх у тэксце, логіцы паслядоўнага выкладу матэрыялу.

3. Кожны дадатак павінен пачынацца з новай старонкі з указаннем слова *Дадатак* і мець тэматычны загаловак, напрыклад: Вынікі канстатуючага этапу педагагічнага эксперымента.

4. Сувязь асноўнага тэксту з дадаткамі ажыццяўляецца праз спасылкі, якія афармляюцца са словам глядзі, напрыклад, (гл. дадатак 3).

**Абарона курсавой/дыпломнай працы** з'яўляецца публічнай, праходзіць у студэнцкай групе. Працэдура абароны падразумявае выступленне студэнта і адказы на пытанні па тэме работы, якія задаюць члены камісіі і тыя, хто прысутнічае на абароне. Выканаўца павінен загадзя прадумаць адказы на агульныя пытанні, якія могуць прагучаць пры абароне:

– Чаму вы абралі гэтую тэму для даследавання? Абгрунтуйце яе актуальнасць.

– Як адлюстравана ў вашым даследаванні сувязь з сучаснымі праблемамі айчыннай педагагічнай тэорыі і адукацыйнай практыкі?

– Якія мэту і задачы вы ставілі ў сваім навуковым даследаванні? Што хацелі даказаць? Ці ўсе задачы працы вырашаны?

– Якія асноўныя крыніцы айчыннай/замежнай навукова-метадычнай думкі вы скарысталі ў даследаванні? Якія моманты ў прачытаных крыніцах вам здаліся найбольш цікавымі? Якія ідэі/матэрыял вы скарысталі ў працы?

– Пазіцыі якіх даследчыкаў вы раздзяляеце? Якія навуковыя ідэі, палажэнні вы не падзяляеце ў кантэксце ўласнай працы? Чаму?

– Які галоўны вынік вашай працы?

– Ці збіраецеся прадаўжаць даследаванне па гэтай тэме ў будучым? Калі збіраецеся, то якія асноўныя накірункі/аспекты працы вы бачыце як перспектыўныя?

– Якім чынам вам дапамогуць веды, уменні, атрыманыя ў працэсе працы над курсавой?

Калі студэнт належным чынам падрыхтаваўся да абароны, даў поўныя, вычарпальныя адказы на пытанні, што ўтрымліваюцца ў водзыве навуковага кіраўніка/рэцэнзента, на дадатковыя пытанні, канчатковая адзнака можа быць павышана — у параўнанні з прапанаванай у рэцэнзіі.

**Прэзентацыя да курсавой/дыпломнай працы.** Пасля таго як праца напісана, падрыхтавана, застаецца істотнае — як найлепшым чынам данесці ключавыя моманты праведзенага даследавання. Гэтую задачу дапамагае

вырашыць прэзентацыя да працы. Паколькі на выступленне адводзіцца абмежаваны час — да 10 хвілін, пры абароне дыпломнай — да 15 хвілін, трэба ўлічваць час (значыць і аб'ём), які будзе патрачаны на даклад.

Прамова акцэнтуе ўвагу на значных палажэннях даследавання. Кожны слайд павінен утрымліваць найбольш істотную інфармацыю. Задача дакладчыка — выдзеліць галоўнае, прапанаваць сутнасны каментарый у працэсе прэзентацыі. Паспяховасць забяспечваецца значымым зместам і прадуманасцю структуры.

*Уступ*. Першая частка выступлення — вітанне аўдыторыі, сціслая характарыстыка агульнага напрамку працы. Агучваецца актуальнасць тэмы, сцісла каменціруецца змест і ход даследавання.

*Асноўная частка*. Слайды прэзентацыі адлюстроўваюць ключавыя тэзісы працы. Звычайна дэманструюцца ключавыя палажэнні, асноўныя статыстычныя дадзеныя, значымыя лічбы.

*Заключэнне*. У ім падводзяцца і дэманструюцца асноўныя вынікі. Вывады ў сціслай форме падаюцца на слайдах, вусна дапаўняюцца і паглыбляюцца. У канцы выступлення, як правіла, выказваюцца словы ўдзячнасці навуковаму кіраўніку за дапамогу, членам камісіі — за ўвагу і пытанні па змесце працы. Развіццё інфармацыйных тэхналогій прыводзіць да разнастайных магчымасцей пры падрыхтоўцы прэзентацыі. Якія памылкі варта папярэдзіць у прэзентацыі?

– *Вялікая колькасць слайдаў*. Слайды павінны адлюстроўваць асноўныя, ключавыя моманты даследчай працы. Калі слайдаў шмат, то выступоўца не паспее адэкватна пракаменціраваць іх, а слухачы могуць страціць логіку выступлення.

– *Нешматлікая колькасць слайдаў*. Калі інфармацыі недастаткова, страчваецца паўнацэннае ўспрыманне выступлення і логіка прэзентацыі.

– *Збыткоўная інфармацыя на слайдах*. Правільны выбар памеру шрыфту таксама ўплывае на якасць прэзентацыі. Малы шрыфт — перашкода для ўспрымання тэксту. Занадта вялікі шрыфт — таксама памылка ў афармленні слайдаў. Звычайна для загалоўкаў памер шрыфта — 28–34 пт. Для асноўнага тэксту слайда шрыфт вар'іруецца ад 24 пт да 30 пт.

Тыповая памылка афармлення прэзентацыі — *празмерная колькасць эфектаў анімацыі*. Зразумела: анімацыя надае прэзентацыі пэўны дынамізм, ажыўляе выступленне. Аднак празмернае выкарыстанне эфектаў можа адцягваць увагу слухачоў ад зместу прамовы.

Поспех выступлення заснаваны на захаванні пэўных патрабаванняў: глыбокі, прадуманы змест, структураванасць матэрыялу, акадэмічны стыль прэзентацыі, уменні выдзеліць галоўнае, трымацца перад аўдыторыяй, пераконваць слухачоў у сваёй пазіцыі, утрымліваць увагу слухачоў.

Такім чынам, у выступленні неабходна акцэнтаваць увагу на актуальнасці выбранай тэмы, тэарэтычных асновах працы, уменнях лагічна разважаць, расказваць пра галоўныя вывады даследавання. Неабходна

раскрыць практычную значнасць вынікаў, магчымасць іх укаранення ў педагагічную практыку або выкарыстанне ў адукацыйным працэсе. Асобным слайдам можна прапанаваць спіс уласных публікацый па тэме, а таксама акты ўкаранення вынікаў працы. У канцы выступлення аўтар звычайна адказвае на пытанні аўдыторыі, гэта трэба рабіць карэктна і добразычліва, у адпаведнасці з патрабаваннямі навуковага этыкету.

Такім чынам, слова на абароне мае прэзентатыўныя задачы (даследчыя задачы вырашаюцца ў самой працы):

– прэзентацыя метадалагічных кампанентаў працы (праблема, мэта, задачы, логіка працы);

– сціслае прадстаўленне тэарэтычных высноў даследавання;

– ілюстрацыя эмпірычных дадзеных і вывадаў працы;

– дэманстрацыя практычнага прымянення вынікаў і матэрыялаў даследавання.

*Выступленне на абароне* варта прагаворваць, а не зачытваць, што патрабуе ад аўтара рытарычных уменняў і навыкаў. Трэба памятаць, што выступленне рэгламентавана па часе: ад 7(10) да 15 хвілін, што вымушае думаць пра інфарматыўнасць маўлення.

*Схема падрыхтоўкі выступлення на абароне курсавой/дыпломнай працы.*

Шаноўныя члены камісіі па абароне курсавой працы!

Шаноўны старшыня, шаноўныя члены Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі!

Вашай увазе прапануецца даследаванне па тэме…

Актуальнасць праблемы абумоўлена тым, што…

Праблемай займаюцца такія аўтарытэтныя вучоныя, як… (хто праводзіў даследаванні і якія аспекты праблемы раскрываліся)…

Праблема нашага даследавання…

Мэта даследавання заключаецца ў…

Для дасягнення мэты былі сфармуляваны наступныя задачы…

Вывучыўшы тэарэтычны аспект даследаванай праблемы, мы распрацавалі праграму вопытна-эксперыментальнай працы…

Мэта эксперыментальнай працы…

Эксперыментальная праца праводзілася на базе…

Эксперымент складаўся з трох этапаў, кожны з якіх меў на ўвазе вырашэнне пэўнай задачы.

І этап — канстатуючы эксперымент. Яго мэта…

Для дасягнення мэты…

Вынікі паказалі…

ІІ этап нашай працы — правядзенне навучальнага эксперымента. Мэта навучальнага эксперымента…

Для дасягнення мэты… (паведаміць, якая канкрэтная праца была праведзена, прывесці прыклады).

На кантрольным этапе эксперыментальнага даследавання мы вызначылі эфектыўнасць праведзенай працы.

Каб наглядна ўбачыць змены, мы правялі…

Вынікі паказалі, што…

На аснове аналізу літаратуры, вынікаў вопытна-эксперыментальнай працы зроблены наступныя вывады…

Такім чынам, мэта даследавання дасягнута, сфармуляваныя задачы вырашаны.

Дзякую за ўвагу!

Пасля падрыхтоўкі працы студэнт можа правесці самааналіз навуковага тэксту, арыентуючыся на метадалагічныя крытэрыі і паказчыкі. Прывядзём адзін з варыянтаў самаацэнкі даследавання (табліца 8)[5]:

Табліца 8 — Крытэрыі і паказчыкі самаацэнкі навуковай працы

| Крытэрыі | Пытанні/аспекты для самааналізу |
|---|---|
| Тэма даследавання | Наколькі адэкватнай бачыцца вам фармулёўка тэмы даследавання? Ці ўказвае тэма на вынікі даследавання? |
| Уводзіны | Ці адлюстраваны ва ўводзінах сацыяльны заказ? Ці знайшоў адлюстраванне ва ўводзінах вопыт адукацыйнай практыкі? Як прадстаўлены ва ўводзінах вынікі папярэдніх даследаванняў? |
| Праблема даследавання | Ці карэктна сфармулявана праблема даследавання? Якую навуковую і практычную каштоўнасць мае заяўленая праблема? |
| Мэта і задачы даследавання | У якой ступені зразумела і канкрэтна сфармулявана мэта даследавання? Ці дэталізуюць задачы даследавання шматаспектнасць мэты? |
| Метады даследавання | Ці адпавядаюць метады даследавання сфармуляваным мэце і задачам працы? |
| Змест даследавання | Узровень праведзенага агляду навуковай літаратуры па тэме даследавання. Якасць фармулёвак метадалагічных кампанентаў тэксту. У якой ступені змест, назвы глаў/падраздзелаў адпавядаюць тэме і праблеме даследавання? |
| Тэарэтычная значнасць | Якія аспекты даследавання характарызуюць тэарэтычную значнасць працы? |
| Практычная значнасць | Якія вынікі праведзенага даследавання пацвярджаюць практычную значнасць работы? |
| Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў | Ці з'яўляюцца вывады верагоднымі і абгрунтаванымі? Ці пацвярджаюцца асноўныя вывады працы эмпірычнымі дадзенымі? Якія метады прымяняліся для статыстычнай апрацоўкі эксперыментальных дадзеных? Ці маюцца ў працы метадычныя парады па вывучэнні пэўнай тэмы/раздзела? |

[5]Ибрагимов, Г.И. Развитие способности к критическому анализу научных достижений / Г.И. Ибрагимов, Е.М. Ибрагимова // Педагогика. — 2002. — № 8. — С. 100–103.

| | |
|---|---|
| Якасць афармлення навуковага тэксту | Ці адпавядае маўленчае афармленне тэксту агульнапрынятым патрабаванням? Якія табліцы, дыяграмы, малюнкі прыводзяцца ў тэксце? Якасць іх афармлення. Ці адпавядае спіс крыніц тэме даследавання? Ці з'яўляецца ён паўнацэнным? Ці ўсе спасылкі ў тэксце працы ўключаны ў спіс літаратуры? |

***Заключэнне*** — гэта вынік усёй працы (як тэарэтычнай, так і эмпірычнай частак даследавання), паслядоўны і лагічны выклад асноўных вывадаў. У заключэнні адлюстроўваецца ўзровень дасягнення сфармуляваных мэты і задач. Заключэнне ўяўляе сабой сінтэз тэарэтычнай і эмпірычнай інфармацыі, пры гэтым яно не павінна зводзіцца да механічнай сумы вывадаў, а ўтрымліваць тое новае, сутнаснае, што раскрывае ключавыя вынікі. Бо'льшую каштоўнасць у студэнцкім даследаванні звычайна маюць вывады на аснове эмпірычнай часткі, таму ім варта ўдзяліць пільную ўвагу. Як правіла, заключэнне завяршаецца сціслым апісаннем перспектыў распрацоўкі праблемы.

Варта памятаць: непажадана капіраваць і механічна пераносіць у заключэнне вывады, зробленыя па главах. Яны не павінны даслоўна паўтарацца. У ідэале заключэнне прадстаўляе сістэматызаваную пазіцыю, погляд аўтара на навуковую праблему. Пры гэтым трэба пазбягаць тэзіснага, сціслага выкладу. Для падрыхтоўкі паўнацэннага заключэння неабходна перачытаць усю працу, звярнуць увагу на каштоўнасныя моманты ў змесце.

Пасля таго як праца напісана, рэкамендуецца яшчэ раз звярнуцца да ўводзін з мэтай іх карэкціроўкі, што дае магчымасць актуалізаваць метадалагічныя арыенціры даследавання. Заключэнне ўтрымлівае вывады ў логіцы сфармуляваных мэты і задач даследавання. Падвядзенне вынікаў — гэта не пералік, канстатацыя зробленага, а выклад асноўных палажэнняў, высноў, да якіх прыйшоў аўтар. Вывады могуць размяшчацца ў адпаведнасці з нумарацыяй задач. На аснове заключэння навуковы кіраўнік/рэцэнзент робіць вывад аб паспяховасці даследавання, яго тэарэтычнай і практычнай значнасці. Уменні аўтара сфармуляваць вывады, разгарнуць іх тэарэтычнае і прыкладное значэнне з'яўляюцца паказчыкамі ўсвядомленага, якаснага выканання працы.

Прывядзём прыклад заключэння па тэме "*Этымалагічны аналіз як сродак узбагачэння слоўнікавага запасу навучэнцаў I–IV* класаў".

На аснове аналізу літаратуры па праблеме даследавання мы прыйшлі да наступных вывадаў: лексічная праца на аснове этымалагічнага аналізу з'яўляецца вядучым сродкам узбагачэння слоўніка навучэнцаў. Вялікую ролю ў гэтым плане адыгрывае навукова-папулярная літаратура па этымалогіі для малодшых школьнікаў (працы С.В. Зелянко, выданні серыі "Скарбы мовы" і інш.). Аналіз выданняў для пачатковай школы дазволіў вызначыць тэматычнае поле слоў, значэнне і правапіс якіх рацыянальна вывучаць з апорай на этымалогію: *знічка, ураджай, сшытак, панядзелак,*

*аўторак, серада, чацвер, пятніца, тыдзень, беларускамоўныя назвы месяцаў, шчасце, вокны, раздзел, заключэнне* і інш.

У працы вызначана паслядоўнасць вывучэння, прапанавана сістэма заданняў, скіраваных на замацаванне спосабаў выкарыстання этымалагічных даведак. У выніку эксперыментальнага навучання ў большасці навучэнцаў (74,6%) сфарміраваны наступныя навыкі:

– заўважаць у сказах і тэкстах новыя словы і тлумачыць іх значэнне з апорай на паходжанне, марфемны састаў;

– шукаць арфаграфічную “падказку” ў зыходным значэнні слова, у яго паходжанні, тлумачыць слова з апорай на корань, іншыя значымыя часткі.

У працэсе прымянення распрацаванай методыкі ў навучэнцаў сфарміравана ўяўленне пра мову як зменлівую, дынамічную з’яву, пра сувязь мовы з гісторыяй народа, краіны, пра іх узаемадзеянне, паралелі беларускай/рускай/іншых моў.

Этымалагічны аналіз слова на ўроках беларускай мовы садзейнічае развіццю лагічнага мыслення навучэнцаў, актывізуе цікавасць да вывучэння роднай мовы. Ён дапамагае зразумець сваякоў, “радавод” адзінкі, уявіць яе першапачатковую структуру і словаўтваральныя сувязі. З дапамогай этымалагічнага аналізу можна прасачыць, як змянялася значэнне слова.

# 3 МЕТАДАЛАГІЧНЫ КАМЕНТАРЫЙ ДА ПРАЦ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (З УЛІКАМ АБ’ЕКТА І ПРАДМЕТА ДАСЛЕДАВАННЯ)

Тэматыка прац па методыцы надзвычай разнастайная. Яна ахоплівае як агульныя пытанні выкладання беларускай мовы (методыка як навука, станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы, заканамернасці засваення мовы, прынцыпы навучання, метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах), пытанні раздзела “Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах” (мэты і змест моўнай адукацыі, асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах адукацыі з рускай і беларускай мовамі навучання і выхавання, асаблівасці арганізацыі ўрока беларускай мовы, спецыфіка кантрольна-ацэначнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы), так і канкрэтныя аспекты вывучэння асноўных раздзелаў школьнага курса беларускай мовы (методыка вывучэння асноў фанетыкі, элементаў лексікалогіі, марфемнага саставу слова і элементаў словаўтварэння, методыка вывучэння марфалогіі, арфаграфіі, сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах). Тэматыка курсавых/дыпломных прац непасрэдна звязана з вучэбнымі праграмамі вучэбнага прадмета “Беларуская мова” і дзейнымі падручнікамі па беларускай мове.

## *3.1 Методыка вывучэння фанетыкі і графікі*

Падчас працы па дадзенай тэматыцы студэнты павінны атрымаць выразнае ўяўленне пра задачы, аб'ём і змест курса фанетыкі, метады і прыёмы яе выкладання. Метадычны статус гэтага раздзела надзвычай высокі: фанетычныя звесткі неабходныя для засваення асноўных норм літаратурнага вымаўлення, выпрацоўкі асноўных арфаграфічных навыкаў, паспяховай працы над складам слова, над змяненнем часцін мовы. Урокі па фанетыцы павінны раскрыць вучням прыгажосць у гучанні беларускай мовы, ролю вобразна-выяўленчых сродкаў у мастацкіх тэкстах.

Пры вывучэнні фанетыкі і графікі вучні павінны навучыцца выразна размяжоўваць паняцці *гук і літара*, не блытаць іх, што нярэдка сустракаецца ў школьнай практыцы. Увага акцэнтуецца на тэмах, якія традыцыйна ўяўляюць значную цяжкасць для навучэнцаў. Напрыклад, утварэнне гукаў, іх характарыстыкі (цвёрдыя/мяккія, звонкія/глухія), гукавое значэнне літар *я, ю, е, ё, і*. У працэсе вывучэння раздзела вучні засвойваюць найважнейшыя правілы правапісу ў беларускай мове. Важна фарміраваць уменне бачыць арфаграмы, развіваць арфаграфічную пільнасць навучэнцаў. Хаця фанетычныя веды ў курсе беларускай мовы для пачатковай школы займаюць невялікі аб'ём, іх значэнне вельмі істотнае. Фанетычныя звесткі неабходныя для засваення асноўных нормаў беларускага літаратурнага маўлення, фарміравання вядучых арфаграфічных навыкаў.

Праілюструем сфармуляваныя патрабаванні на прыкладзе тэмы "*Фарміраванне арфаэпічных уменняў навучэнцаў I–IV класаў на ўроках беларускай мовы*". Змест і структура гэтай працы можа мець наступны *метадалагічны каментарый*.

*Актуальнасць тэмы даследавання* абумоўлена неабходнасцю фарміравання арфаэпічных уменняў як метадычнай умовы паўнацэннага беларускага маўлення. Засваенню асноўных арфаэпічных нормаў садзейнічае захаванне лексічных норм, развіццё эстэтычных адносін да беларускай мовы, асэнсаваны выбар арфаграм. Аналіз сучасных вучэбных праграм, падручнікаў для I–IV класаў дазваляе зрабіць вывад пра недастатковую колькасць арфаэпічных заданняў, пра адсутнасць сістэматычнай працы па арфаэпіі на працягу ўсяго курса беларускай мовы, прыярытэт рэпрадуктыўнага характару практыкаванняў. Такім чынам, актуальнасць тэмы вызначаецца неабходнасцю фарміравання арфаэпічных уменняў у кантэксце пачатковай моўнай адукацыі, стварэння сістэмы практыкаванняў на аснове арфаэпічнага матэрыялу, нераспрацаванасцю метадычных умоў для выпрацоўкі трывалых арфаэпічных уменняў.

*Аб'ект даследавання* — фарміраванне арфаэпічных уменняў малодшых школьнікаў у курсе беларускай мовы.

*Прадмет даследавання* — метадычныя ўмовы трывалага засваення арфаэпічных уменняў, якія забяспечваюць эфектыўнае вывучэнне раздзела ў школьным курсе беларускай мовы.

*Мэта даследавання* — тэарэтычнае абгрунтаванне і эксперыментальная апрабацыя метадычных умоў для фарміравання трывалых арфаэпічных нормаў навучэнцамі. Для дасягнення мэты даследавання сфармуляваны *наступныя задачы*:

– вывучыць навукова-метадычную літаратуру па праблеме даследавання;

– прааналізаваць арфаэпічны матэрыял, уключаны ў школьны курс беларускай мовы;

– выявіць спецыфіку арфаэпічнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы ў I–IV класах;

– распрацаваць сістэму арфаэпічных практыкаванняў для навучэнцаў I–IV класаў;

– вызначыць эфектыўнасць метадычных умоў паўнацэннага фарміравання арфаэпічных уменняў малодшых школьнікаў.

Для вырашэння сфармуляваных задач выкарыстоўваюцца наступныя *метады даследавання*: тэарэтычныя (вывучэнне літаратуры па праблеме, аналіз вучэбных праграм і падручнікаў у кантэксце даследаванай тэмы); эмпірычныя (вопытна-эксперыментальная праца, аналіз дыягнастычных і кантрольных работ навучэнцаў); колькасная і якасная апрацоўка эксперыментальных дадзеных.

*Тэарэтычная значнасць працы* заключаецца ў вызначэнні арфаэпічнага матэрыялу як эфектыўнага сродку паўнацэннага вывучэння беларускай мовы, у выяўленні метадычных умоў засваення арфаэпічных ведаў: арганізацыя вуснага маўленчага асяроддзя, прадуктыўнага беларускамоўнага ўзаемадзеяння навучэнцаў паміж сабой і з настаўнікам, сістэматычнае захаванне арфаэпічных нормаў пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса, выкарыстанне ўзору вуснага маўлення, уключэнне арфаэпічнага матэрыялу ва ўсе віды маўленчай дзейнасці — слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо.

*Практычная значнасць даследавання* заключаецца ў распрацоўцы алгарытму арфаэпічных нормаў: вуснае ўспрыманне моўнага матэрыялу, прыярытэтнае вуснае выкананнне заданняў, падрыхтоўка маўленчых выказванняў з захаваннем арфаэпічных нормаў, самакантроль і кантроль за вусным маўленнем навучэнцаў. *Змест* працы можа быць наступным.

Уводзіны .........................................................................................................
1 Тэарэтычныя аспекты фарміравання арфаэпічных уменняў малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы .......................................................
1.1 Фактары фарміравання паўнацэнных арфаэпічных уменняў навучэнцаў на ўроках беларускай мовы ................................................
1.2 Характарыстыка арфаэпічнага матэрыялу ў курсе школьнай моўнай адукацыі: змест, спецыфіка засваення арфаэпічных нормаў .................

1.3 Метадычныя ўмовы станаўлення паўнацэнных арфаэпічных уменняў у школьным курсе беларускай мовы ........................................
2 Метадычная сістэма фарміравання арфаэпічных уменняў малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы .....................................................
2.1 Узроўні сфарміраванасці арфаэпічных уменняў навучэнцаў I–IV класаў ...........................................................................................
2.2 Практычная рэалізацыя метадычных умоў фарміравання арфаэпічных уменняў на ўроках беларускай мовы .................................
2.3 Аналіз вынікаў канстатуючага і кантрольнага этапаў вопытна-эксперыментальнай працы ...................................................................
Заключэнне ..........................................................................................................
Спіс выкарыстаных крыніц ..............................................................................

## *3.2 Методыка вывучэння лексікі*

У працэсе выканання курсавой/дыпломнай працы па лексіцы трэба ўлічваць круг лексічных паняццяў, якія засвойваюць навучэнцы I–IV класаў: *слова як моўная адзінка, значэнне слова, адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнне слова, сінонімы, антонімы, міжмоўныя амонімы* і інш. У школьным курсе навучэнцы атрымліваюць веды пра слоўнікавае багацце беларускай мовы, знаёмяцца з фразеалагічнымі выразамі. Лексічныя паняцці выступаюць асновай для развіцця маўлення навучэнцаў, актывізацыі і ўзбагачэння іх слоўніка. Пры засваенні раздзела школьнікі вучацца выкарыстоўваць у маўленні багатыя магчымасці беларускамоўнай лексікі, знаходзіць сярод мноства слоў самыя неабходныя. У працах па методыцы вывучэння лексікі абавязковай умовай з’яўляецца выкарыстанне слоўнікаў, веданне методыкі працы з імі. Прывядзём прыкладны *метадалагічны каментарый* да тэмы “*Праца са словам на аснове тэксту на ўроках беларускай мовы ў пачатковай школе*”.

*Актуальнасць тэмы даследавання.* Праблема павышэння ўзроўню культуры вуснага і пісьмовага маўлення малодшых школьнікаў з’яўляецца адной з запатрабаваных у сучаснай методыцы беларускай мовы. Найважнейшым напрамкам працы з’яўляецца ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, які, на жаль, часта застаецца неактыўным і абмежаваным. Значэнне тэксту ў рэчышчы ўзбагачэння слоўніка, у павышэнні ўзроўню маўленчай культуры — імператыў сучаснай лінгваметодыкі. Менавіта ў тэксце праяўляецца і канкрэтызуецца значэнне слова, таму аналіз тэксту — неад’емны кампанент працы па развіцці маўлення і мыслення навучэнцаў.

Лексічная праца на аснове тэксту звязана з фарміраваннем моўнай і маўленча-камунікатыўнай кампетэнцый на ўроках беларускай мовы, садзейнічае станаўленню моўнай асобы навучэнца. Аналіз тэарэтыка-эксперыментальных даследаванняў, адукацыйнай практыкі выяўляе

рэальны стан лексічных ведаў, уменняў, навыкаў малодшых школьнікаў. Слоўнікавы запас некаторых навучэнцаў застаецца збедненым, што прыводзіць да парушэння такіх патрабаванняў да маўлення, як багацце і выразнасць. Невялікая колькасць сінонімаў у маўленні школьнікаў не дазваляе дакладна і прыгожа фармуляваць думкі і пачуцці. Абмежаванае ўжыванне сінонімаў, антонімаў, слоў з пераносным значэннем, эпітэтаў, параўнанняў сведчыць пра адсутнасць эмацыянальнага і паўнацэннага маўлення. У вусных/пісьмовых тэкстах допускаюцца шматлікія лексіка-семантычныя і лексіка-стылістычныя памылкі.

Такім чынам, актуальнасць тэмы працы вызначаецца недастатковай распрацаванасцю праблемы ў айчыннай метадычнай навуцы і пацвярджаецца неабходнасцю стварэння методыкі працы са словам на аснове тэксту.

*Аб'ектам даследавання* з'яўляецца праца са словам на аснове тэксту як сродку развіцця маўлення навучэнцаў.

*Прадмет даследавання* — метадычная сістэма працы са словам на аснове тэксту: этапы, метады і прыёмы навучання, комплекс лексічных практыкаванняў.

*Мэта працы* заключаецца ў тэарэтычнай распрацоўцы і эксперыментальнай праверцы метадычнай сістэмы працы са словам на аснове тэксту на ўроках беларускай мовы. Сфармуляваныя мэта, аб'ект і прадмет даследавання падразумяваюць *вырашэнне наступных задач*:

– вызначыць тэарэтычныя асновы працы са словам на аснове тэксту ў пачатковай школе;

– выявіць тэарэтычны і практычны аспекты ў працы са словам і тэкстам праз аналіз вучэбных праграм і сучасных падручнікаў па беларускай мове;

– распрацаваць методыку працы са словам у працэсе аналізу тэксту: асноўныя этапы, эфектыўныя метады і прыёмы, сістэма практыкаванняў, якія адпавядаюць мэце даследавання;

– эксперыментальна праверыць эфектыўнасць распрацаванай методыкі, статыстычна апрацаваць, інтэрпрэтаваць вынікі педагагічнага эксперымента.

Вырашэнне сфармуляваных задач ажыццяўляецца з дапамогай асноўных *метадаў даследавання*: тэарэтычны аналіз метадычнай, псіхолага-педагагічнай і лінгвістычнай літаратуры па праблеме; аналіз пісьмовых прац навучэнцаў у кантэксце тэмы даследавання; вопытна-эксперыментальная праца з мэтай праверкі эфектыўнасці распрацаванай методыкі; параўнальны аналіз эксперыментальных дадзеных па выніках канстатуючага і кантрольнага этапаў вопытнай працы.

*Тэарэтычная значнасць даследавання* заключаецца ў вызначэнні аб'ёму лексічных паняццяў, адаптаваных для разумення школьнікаў малодшых класаў.

*Практычная значнасць* вызначаецца праз паслядоўнасць працы са словам, якая адпавядае метадычнаму ланцужку: *тэкст → слова → словазлучэнне → сказ → тэкст,* у распрацоўцы комплексу практыкаванняў, адпаведных задачам даследавання.


Уводзіны ........................................................................................................
1 Лінгваметадычныя асновы працы са словам на аснове аналізу тэксту ..
1.1 Псіхолага-педагагічныя асновы працы са словам у пачатковай школе ...........................................................................................................
1.2 Мэта, прынцыпы, этапы працы са словам у працэсе аналізу тэксту
1.3 Крытэрыі і крыніцы адбору дыдактычнага матэрыялу для працы са словам ..........................................................................................................
2 Метадычная сістэма працы са словам на аснове тэксту ..............................
2.1 Метады і прыёмы працы са словам у працэсе аналізу тэксту ..........
2.2 Сістэма практыкаванняў для працы са словам на аснове тэксту ......
2.3 Аналіз эфектыўнасці прапанаванай сістэмы працы са словам на аснове тэксту ................................................................................................
Заключэнне ......................................................................................................
Спіс выкарыстаных крыніц ............................................................................


## *3.3 Методыка вывучэння складу слова і словаўтварэння*

У працах па словаўтваральнай тэматыцы аўтар павінен усведамляць метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць для вызначэння ролі словаўтварэння пры вывучэнні марфалогіі, правапісу і развіцця маўленчых навыкаў навучэнцаў. Асноўная мэта прац па словаўтварэнні — абагульніць элементарныя звесткі па саставе слова, якія вывучаюцца ў пачатковай школе, сфарміраваць у навучэнцаў вядучыя паняцці пра структуру беларускага слова, ролю значымых частак у слове. Не дапускаючы ўскладнення і спрашчэнства, трэба адпрацоўваць паняцці *аснова, канчатак, корань, прыстаўка, суфікс.* Адно з частотных заданняў — разбор слова па саставе – ставіць за мэту выяўленне ролі значымых частак. Рэкамендуецца даказваць, што склад слова, яго падзел на значымыя часткі адбываецца шляхам супастаўлення і параўнання слоў. Важна, каб пры гэтым выразна размяжоўваліся аснова слова і яго канчатак, штораз падкрэслівалася: выдзяленне канчатка праводзіцца звычайна шляхам змянення слова — скланення або спражэння, ілюстраваліся метады і прыёмы вылучэння ў аснове слова кораня, прыстаўкі і суфікса праз паслядоўнае параўнанне роднасных слоў, падбор слоўных ланцужкоў. Мэтанакіраваная дзейнасць засцерагае навучэнцаў ад выпадковага ўгадвання марфем і рыхтуе да элементарнага асэнсавання асноўных спосабаў словаўтварэння. У работах па методыцы вывучэння словаўтварэння неабходна ўдзяляць увагу развіццю маўлення на базе лексічнага матэрыялу (падбор роднасных адзінак, прыёмы

семантызацыі, праца з сінонімамі, антонімамі, з правапісам слоў). Рацыянальна выкарыстоўваць этымалагічныя даведкі з мэтай павысіць цікавасць да ўрокаў беларускай мовы. Так, да тэмы "*Методыка засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу навучэнцаў I–IV класаў* " можна прапанаваць наступны метадалагічны каментарый.

*Актуальнасць тэмы*. Зварот да спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу малодшых школьнікаў з'яўляецца надзённым. Актуальнасць тэмы, з аднаго боку, абумоўлена запатрабаванасцю ў тэарэтычным абгрунтаванні шляхоў і спосабаў спазнання навучэнцамі элементаў словаўтварэння, з другога боку — неабходнасцю падбору сістэмы заданняў, скіраваных на распрацоўку методыкі, якая забяспечыць эфектыўнасць вывучэння раздзела.

*Аб'ектам даследавання* з'яўляецца засваенне элементаў словаўтварэння ў пачатковай школе.

*Прадметам даследавання* выступаюць метадычныя ўмовы эфектыўнага засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу малодшых школьнікаў.

*Мэта працы* — тэарэтычнае абгрунтаванне, распрацоўка і эксперыментальная праверка эфектыўнасці ўмоў для засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу навучэнцаў. Рэалізаваць мэту даследавання дапамагае *вырашэнне наступных задач*:

– выявіць лінгваметадычны патэнцыял сучасных вучэбна-метадычных матэрыялаў для эфектыўных спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу малодшых школьнікаў;

– вызначыць лінгваметадычныя ўмовы паўнацэннага фарміравання эфектыўных спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу;

– ахарактарызаваць узроўні ведаў малодшых школьнікаў у галіне словаўтварэння, узроўні сфарміраванасці спосабаў засваення элементаў словаўтварэння з улікам пазнавальнага інтарэсу малодшых школьнікаў;

– правесці вопытна-эксперыментальную праверку прапанаванай методыкі засваення элементаў словаўтварэння і выявіць яе эфектыўнасць.

З мэтай вырашэння сфармуляваных задач выкарыстоўваюцца наступныя *метады даследавання*: тэарэтычныя (аналіз псіхолага-педагагічнай, лінгваметадычнай літаратуры, вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай мове для настаўнікаў пачатковай школы ў аспекце даследаванай праблемы), эмпірычныя (мэтанакіраванае назіранне за працэсам навучання словаўтварэнню малодшых школьнікаў, педагагічны эксперымент (канстатуючы этап, вопытнае навучанне, кантрольны зрэз); якасны і колькасны аналіз вынікаў педагагічнага эксперымента, параўнанне дадзеных на розных этапах вопытнай працы.

*Тэарэтычная значнасць праведзенага даследавання* заключаецца ў абгрунтаванні методыкі фарміравання спосабаў засваення элементаў

словаўтварэння малодшымі школьнікамі, ва ўстанаўленні ўзаемасувязі словаўтваральных ведаў і ўзроўняў сфарміраванасці ўменняў, навыкаў навучэнцаў, у выяўленні эфектыўнасці спосабаў засваення элементаў словаўтварэння з улікам пазнавальнага інтарэсу навучэнцаў.

*Практычная значнасць даследавання* вызначаецца праведзеным аналізам сучасных дыдактычных матэрыялаў у аспекце выяўлення патэнцыялу для засваення элементаў словаўтварэння; у распрацоўцы заданняў, пабудаваных на матэрыяле словаўтварэння з мэтай фарміравання спосабаў засваення элементаў словаўтварэння. Змест працы можа быць наступным.

Уводзіны ..........................................................................................
1 Тэарэтычныя асновы фарміравання спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу малодшых школьнікаў ...
1.1 Лінгваметадычная спецыфіка вывучэння элементаў словаўтварэння ў пачатковай школе ..........................................................................
1.2 Пазнавальны інтарэс як база засваення элементаў словаўтварэння на ўроках беларускай мовы ..................................................................
1.3 Пазнавальныя заданні як вядучы сродак спазнання элементаў словаўтварэння малодшымі школьнікамі ...............................................
2 Практыка фарміравання спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу навучэнцаў ...............................................
2.1 Метадычныя ўмовы эфектыўнай працы па фарміраванні ў малодшых школьнікаў спосабаў засваення элементаў словаўтварэння
2.2 Зыходны ўзровень сфарміраванасці ў навучэнцаў спосабаў засваення элементаў словаўтварэння з улікам пазнавальных інтарэсаў навучэнцаў .........................................................................................
2.3 Практычная рэалізацыя сістэмы заданняў, скіраваных на фарміраванне спосабаў засваення элементаў словаўтварэння на аснове пазнавальнага інтарэсу .......................................................
Заключэнне ......................................................................................
Спіс выкарыстаных крыніц ..........................................................

## *3.4 Методыка вывучэння марфалогіі*

Значнае месца ў школьным курсе беларускай мовы займае засваенне марфалогіі. У працах па методыцы вывучэння часцін мовы трэба ўлічваць, што вывучэнне змянення і ўтварэння часцін мовы цесна звязана з замацаваннем практычных навыкаў навучэнцаў, працай па арфаграфіі і развіцці маўлення. Істотна, каб у выніку ўрокаў па марфалогіі школьнікі не толькі навучыліся знаходзіць у сказе/тэксце тую або іншую часціну мовы, пазнаваць яе на аснове граматычных прымет, але і выкарыстоўвалі марфалагічныя веды для фарміравання арфаграфічнай пісьменнасці, павышэння культуры вуснага і пісьмовага маўлення. У працэсе вывучэння

марфалогіі варта ажыццяўляць пастаянную сувязь з сінтаксісам: характарызаваць сказы ў сінтаксічных адносінах, выконваць заданні сінтаксічна-пунктуацыйнага характару.

Прапануем метадалагічны каментарый да тэмы "*Вывучэнне марфалогіі навучэнцамі II–IV класаў з улікам прынцыпу пераемнасці*".

*Актуальнасць тэмы.* Раздзел "Часціны мовы" — адзін з найважнейшых у школьным курсе беларускай мовы, ад паспяховага вывучэння якога залежаць засваенне марфалагічных нормаў, развіццё інтэлектуальных, творчых здольнасцей моўнай асобы. Спасціжэнне марфалогіі мае вялікі лінгваметадычны патэнцыял. Веды па марфалогіі служаць фундаментам для фарміравання правапісных уменняў і навыкаў, раскрываюць магчымасці граматычнай тэорыі ў развіцці маўлення навучэнцаў. Фармальна засвоеныя правілы не могуць стаць трывалай асновай для асэнсавання граматычных з'яў. Актуальнасць тэмы абумоўлена наступным: засваенне граматыкі ўплывае на агульнае развіццё, абстрактнае мысленне і інтэлектуальнае станаўленне моўнай асобы. Граматычная кампетэнтнасць забяспечвае базу для засваення школьнага курса сінтаксісу.

Такім чынам, актуальнасць тэмы вызначаецца неабходнасцю аптымізаваць умовы, пры якіх вывучэнне марфалогіі ў пачатковай школе будзе максімальна адпавядаць узроставым і псіхолага-педагагічным асаблівасцям навучэнцаў.

*Аб'ект даследавання* — навучанне марфалогіі ў II–IV класах.

*Прадмет даследавання* — метадычная сістэма навучання марфалогіі з улікам рэалізацыі прынцыпу пераемнасці ў курсе беларускай мовы (II–IV класы).

*Мэта даследавання* заключаецца ў тэарэтычным асэнсаванні і распрацоўцы сістэмы навучання марфалогіі ў II–IV класах. Прапанаваная методыка павінна забяспечыць паўнацэнную рэалізацыю прынцыпу пераемнасці ў навучанні марфалогіі.

У адпаведнасці з мэтай даследавання вырашаюцца *наступныя задачы*:

– правесці аналіз літаратуры па праблеме даследавання з мэтай вызначыць тэарэтычныя асновы працы;

– удакладніць адбор граматычных паняццяў, вядучых уменняў навучэнцаў, распрацаваць аптымальныя ўмовы засваення школьнага курса марфалогіі;

– зафіксаваць зыходны ўзровень марфалагічных ведаў і ўменняў навучэнцаў, выявіць асноўныя цяжкасці ў засваенні школьнага курса марфалогіі, абумоўленыя парушэннем рэалізацыі прынцыпу пераемнасці;

– распрацаваць методыку вывучэння марфалогіі ў II–IV класах, выявіць найбольш эфектыўныя сродкі яе рэалізацыі, што забяспечваюць захаванне пераемнасці пры вывучэнні граматычных звестак;

– эксперыментальна праверыць эфектыўнасць распрацаванай методыкі.

Для вырашэння сфармуляваных задач прымяняецца *комплекс метадаў*: аналіз лінгваметадычнай літаратуры па праблеме, сучасных праграм і падручнікаў па беларускай мове для II–IV класаў, аналіз пісьмовых прац навучэнцаў, якасная і колькасная апрацоўка вынікаў педагагічнага эксперымента.

*Тэарэтычная значнасць даследавання* заключаецца ва ўдакладненні мэты, зместу і метадаў навучання марфалогіі ў пачатковай школе з улікам прынцыпу пераемнасці.

*Практычная значнасць даследавання* пацвярджаецца распрацоўкай і эксперыментальнай апрабацыяй сістэмы заданняў, якая рэалізуе сістэмны падыход да вывучэння школьнага курса марфалогіі.

## *3.5 Методыка вывучэння сінтаксісу*

Пры выкананні курсавых/дыпломных прац па методыцы вывучэння сінтаксісу ажыццяўляецца структурна-семантычны падыход да засваення сінтаксічных з’яў. Навучэнцы павінны асэнсавана засвоіць такія паняцці, як *апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя сказы, галоўныя і даданыя члены сказа, сувязі слоў у сказе, сказы з аднароднымі членамі, парадак слоў, значэнне і будова простых і складаных сказаў.* На базе тэарэтычных звестак фарміруюцца ўменні свядомага ўжывання сінтаксічных канструкцый у вусным і пісьмовым маўленні, набываюцца пунктуацыйныя навыкі, вызначаныя праграмай. Істотнае месца павінны займаць супастаўленні, параўнанні сінтаксічных з’яў, што неабходна для свядомага вывучэння сінтаксісу ў пачатковай школе.

Тэма “*Методыка вывучэння складанага сказа ў пачатковай школе як умова развіцця маўлення навучэнцаў*” можа мець наступны метадалагічны каментарый.

*Актуальнасць тэмы* вызначаецца роляй складанага сказа ў кантэксце развіцця маўлення, фарміравання ўменняў правільна і камунікатыўна мэтазгодна выкарыстоўваць сінтаксічныя паняцці ў розных пазнавальных сітуацыях.

Уводзіны ..........................................................................................................
1 Тэарэтычныя асновы методыкі вывучэння складанага сказа ў кантэксце развіцця маўлення школьнікаў ........................................................................
1.1 Роля сінтаксісу/граматыкі ў павышэнні культуры маўленчай практыкі навучэнцаў ...........................................................................
1.2 Прынцыпы адбору сінтаксічных паняццяў і асаблівасці іх вывучэння ў рэчышчы маўлення навучэнцаў ........................................
1.3 Лінгваметадычныя асновы засваення складанага сказа ў пачатковай школе ..........................................................................................

2 Практыка вывучэння складанага сказа ў сучаснай пачатковай школе ў аспекце развіцця маўлення ..........................................................................
2.1 Месца і роля складанага сказа ў сучасных праграмах і падручніках па беларускай мове для пачатковай школы ..........................................
2.2 Аналіз пісьмовага маўлення школьнікаў у аспекце выкарыстання складаных сказаў ..........................................................................
2.3 Методыка эксперыментальнага вывучэння складанага сказа ў сістэме маўленчага развіцця малодшых школьнікаў ..........................
Заключэнне ..........................................................................................
Спіс выкарыстаных крыніц ...................................................................

Незалежна ад тэмы курсавая/дыпломная праца павінна афармляцца літаратурнай мовай, абавязковым кампанентам якой выступае тэрміналагічная лексіка. Выклад тэксту ажыццяўляецца ад трэцяй асобы (назіраецца, тлумачыцца, аналізуецца і інш.). Не рэкамендуецца перадача інфармацыі ад першай асобы адзіночнага ліку я назіраў, я лічу, на мой погляд і інш. У сучасным навуковым маўленні прынята выкарыстоўваць займеннік мы, паколькі “навука ў XXI стагоддзі, як сцвярджае Э.Г. Юдзін, мае калектыўны характар, ствараецца шматлікімі вучонымі”. Праз ужыванне займенніка мы даследчык пацвярджае сваю павагу да навуковых здабыткаў папярэднікаў.

# 4 СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ КРЫТЭРЫЯЎ АЦЭНКІ ЯКАСЦІ ПРАВЕДЗЕНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Крытэрыі эфектыўнасці выкананай курсавой/дыпломнай работы суадносяцца з яе зместам, структурай, метадалагічнымі параметрамі і афармленнем:

– *выбар тэмы даследавання:* фармулёўка тэмы сцісла адлюстроўвае наступныя паказчыкі: *мэта, суб’ектная аснова, метадычныя сродкі, установа адукацыі, на базе якой ажыццяўляецца вопытна-эксперыментальная праца*;

– *спіс літаратуры* па тэме даследавання ўключае манаграфіі, навуковыя публікацыі, артыкулы з прафесійных часопісаў, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый, інтэрнэт-крыніцы і г.д.;

– *уводзіны* ўключаюць устаноўленыя кампаненты і перадаюць іх паслядоўнасць:

– *актуальнасць тэмы* вызначаецца праз прывядзенне аргументаў, якія раскрываюць патрэбнасць у вывучэнні праблемы, што мае значэнне для соцыуму, педагагічнай навукі і адукацыйнай практыкі;

– *агляд літаратуры па тэме* праводзіцца ў шырокім кантэксце даследаванай праблемы, са спасылкамі на канкрэтныя крыніцы айчынных і замежных даследчыкаў; маецца гістарычны экскурс у развіццё тэмы/праблемы, дэманструецца аналіз розных аспектаў/напрамкаў працы;

– вызначэнне *праблемы даследавання*, сфармуляванай, як правіла, у форме пытання;

– выдзяленне і *аналіз ключавых паняццяў* даследавання;

– *мэта працы*, якая вынікае з тэмы і праблемы даследавання;

– *задачы даследавання*, сфармуляваныя ў дзеяслоўнай форме, адлюстроўваюць паслядоўнасць выканання працы, колькасць задач, іх фармулёўка адпавядаюць агульнапрынятым патрабаванням;

– *змест даследавання, назвы раздзелаў і падраздзелаў* вынікаюць з задач працы;

– *аб'ект даследавання* сфармуляваны ў рэчышчы тэмы (фактычна аб'ект "спраецыраваны" ў назве тэмы);

– *прадмет даследавання* вызначаны ў адпаведнасці з тэмай; гэта той вынік, якога хоча дасягнуць даследчык;

– *метады даследавання*: *тэарэтычныя* (тэарэтычны аналіз, аналіз і сінтэз педагагічных з'яў, аналіз літаратуры, мадэляванне і інш.) і *эмпірычныя*, *практычныя* (назіранне, абагульненне перадавога вопыту, аналіз прадуктаў пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў — пераказы, сачыненні, самастойныя і кантрольныя працы, малюнкі і інш., аналіз школьнай дакументацыі, вучэбных праграм вучэбных прадметаў, падручнікаў, педагагічны эксперымент і інш.);

– *эксперыментальная база даследавання*;

– *тэарэтычная значнасць даследавання* (удакладненне пэўных паняццяў, падбор метадычнага інструментарыю, вызначэнне крытэрыяў, паказчыкаў, узроўняў сфарміраванасці пэўных якасцей, ведаў, уменняў, навыкаў), распрацоўка педагагічных умоў, пры якіх дасягаецца аптымальны ўзровень вывучэння раздзела/тэмы;

– *практычная значнасць даследавання:* распрацоўка праграм вывучэння пэўнай тэмы/раздзела, падрыхтоўка метадычных указанняў, канспектаў урокаў, сцэнарыяў пазакласных мерапрыемстваў, дыдактычнага матэрыялу, сістэмы заданняў і інш.;

– *фармулёўка назвы першай главы даследавання* адлюстроўвае тэарэтычны аспект працы;

– *фармулёўка назвы другой главы* праецыруе практычнае вырашэнне задач даследавання, арыентаванасць на апрабацыю распрацаваных матэрыялаў і педагагічных умоў. Фармулёўкі раздзелаў/падраздзелаў перадаюць сутнасць вопытнай працы, яе мэты, метады, ход эксперымента, падбор дыягнастычных матэрыялаў у адпаведнасці з прапанаванымі крытэрыямі і паказчыкамі, аналіз вынікаў вопытна-эксперыментальнай працы;

– у тэксце працы рэалізуецца *а'драсны зварот да вывучанай літаратуры,* цытаванне адбываецца з устаноўленымі патрабаваннямі (са спасылкамі на старонкі працы), захоўваецца алфавітны парадак пры ўпамінанні прозвішчаў некалькіх аўтараў, ініцыялы аўтараў размяшчаюцца перад прозвішчамі даследчыкаў. Маецца ўласная ацэнка прааналізаваных крыніц, у спіс літаратуры ўключаны прозвішчы даследчыкаў, якія прыводзяцца ў тэксце працы;

– правільна выбудавана *заключэнне,* выкладзеныя палажэнні маюць характар вывадаў;

– *якасць апісання эксперыментальнай работы:* прадстаўлены і абгрунтаваны абраныя аўтарам крытэрыі, паказчыкі і ўзроўні (не менш за тры крытэрыі, адпаведныя зместу ключавога паняцця даследавання);

– *наяўнасць табліц, дыяграм* у даследаванні, якія ў дастатковай ступені адлюстроўваюць вынікі;

– *захаванне правіл афармлення,* якое вызначаецца ўстаноўленым фармаціраваннем тэксту, адпаведны памер і тып шрыфта, наяўнасць абзацнага водступу, захаванне палёў, адэкватнае афармленне назваў раздзелаў і падраздзелаў;

– *належнае фармаціраванне табліц, малюнкаў* (нумарацыя табліц, размяшчэнне назвы табліцы, наяўнасць папярэдніх спасылак на табліцы ў тэксце), афармленне зместу даследавання, захаванне ўстаноўленага аб'ёму працы, адэкватнае афармленне спасылак на крыніцы, карэктнае бібліяграфічнае апісанне крыніц, правільнае размяшчэнне крыніц у спісе літаратуры — па меры ўпамінання ў тэксце, метадычнае абгрунтаванне матэрыялаў, размешчаных у дадатку, наяўнасць спасылак у тэксце на дадаткі;

– *лагічнасць выкладу матэрыялу даследавання:* імкненне да паслядоўнасці навуковага маўлення прыводзіць да актыўнага выкарыстання складаных, у прыватнасці, складаназалежных сказаў з выкарыстаннем простых і складаных падпарадкавальных злучнікаў, характэрных для кніжнага маўлення: *з прычыны таго што, у выніку таго што, у той час як, паколькі, бо, таму што* і г.д.

У тэксце працы тыповыя канструкцыі, што ўскладняюць простыя сказы: пабочныя словы/словазлучэнні/сказы, дзеепрыметныя і дзеепрыслоўныя звароты, развітыя азначэнні і г.д. Названыя моўныя сродкі садзейнічаюць перадачы зместу навуковых паняццяў, устанаўленню адносін паміж родавымі і відавымі паняццямі, паміж прычынай і вынікам, аргументацыяй і вывадамі. Сродкамі сувязі частак навуковага тэксту выступаюць пабочныя канструкцыі *па-першае, па-другое, нарэшце, з аднаго боку, з другога боку,* якія ўказваюць на паслядоўнасць выкладу. Для аб'яднання частак тэксту, напрыклад, абзацаў, якія маюць лагічную сувязь паміж сабой, выкарыстоўваюцца словы і словазлучэнні, што дэманструюць гэтую сувязь.

У мове навуковага тэксту актыўна выкарыстоўваюцца рознага роду клішэ. Лічыцца, што ўжыванне падобных стандартных фраз падпарадкавана спецыфічнай мэце — абазначаць пэўныя фрагменты рэчаіснасці, якія “садзейнічаюць іх лепшаму ўспрыманню, асэнсаванню чытачом і ствараюць інтэлектуальны фон маўлення”[6]. Падобныя маўленчыя штампы дапамагаюць афармляць думку, скіроўваюць яе на сутнасныя, нефармальныя аспекты. Нагадаем, напрыклад, спіс дзеясловаў, якія прынята выкарыстоўваць пры спасылках на “чужыя” выказванні, меркаванні, пры выражэнні ўласных адносін да пазіцыі іншых вучоных: *аналізаваць, пярэчыць, выказваць думку/спадзяванне, дадаваць, доказваць, дапускаць, задаваць пытанне, уздымаць праблему, тлумачыць, канстатаваць, распачынаць, не падзяляць поглядаў/пазіцыі, не згаджацца, выяўляць, абмяркоўваць, адабраць, адстойваць, адзначаць, інфармаваць, паўтараць, падтрымліваць, пацвярджаць, пагаджацца/не пагаджацца, разумець, прапаноўваць, лічыць, мець на ўвазе, дэманстраваць, прызнаваць, раздзяляць пазіцыю, прыходзіць да вываду, разглядаць праблему/пытанне, разважаць, дазваляць, раіць, рэкамендаваць, вырашаць праблему, ісці ўслед за аўтарам/вучоным, даследчыкам, згаджацца, сумнявацца, паведамляць, рабіць спасылку/спасылацца, лічыць, указваць, называць, узгадваць, напамінаць, сцвярджаць, удакладняць, цытаваць, фіксаваць, запазычваць, адрозніваць, дыферэнцыраваць, актуалізаваць, адзначаць, ілюстраваць* і інш.

Такім чынам, падрыхтоўка курсавой/дыпломнай працы — істотны этап даследчай дзейнасці ў кантэксце падрыхтоўкі настаўніка.

---

[6]Эйдельман, Л.Н. Методические рекомендации по оформлению рефератов, курсовых и выпускных квалификационных работ: методические рекомендации / Л.Н. Эйдельман, А.А. Бараев, Е.В. Малышева. — СПб.: Рос. гос. пед. ун-т имени А.И. Герцена, 2023. — С. 4.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Станаўленне будучага педагога як суб’екта адукацыйнага працэсу адбываецца ў ходзе вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці, вынікам якой з’яўляецца падрыхтоўка курсавой і дыпломнай працы. Іх якаснае выкананне выступае паказчыкам гатоўнасці да правядзення самастойнага даследавання. Змест і афармленне курсавой/дыпломнай працы дэманструе метадалагічную культуру выканаўцы, якая падразумявае засваенне нормаў, правіл, логікі навуковага спазнання, уменне вырашаць тэарэтычныя і практычныя задачы.

Курсавая/дыпломная праца сведчыць пра дастатковы ўзровень агульнанавуковай і метадычнай падрыхтоўкі студэнта, яго здольнасць прымяняць тэарэтычныя веды, пра сфарміраванасць практычных навыкаў самастойнага правядзення даследавання: аналізу навуковых крыніц па тэме з супастаўленнем і ацэнкай розных пунктаў погляду, распрацоўкі эксперыментальных праграм, выкарыстання метадычнага інструментарыю.

Метадалагічная культура студэнта з’яўляецца істотным кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі будучага настаўніка. Асэнсаваныя метадалагічныя паказчыкі якаснага даследавання забяспечваюць выніковасць навуковых пошукаў, спрыяюць развіццю адэкватнай рэфлексіі ўласнай дзейнасці, дазваляюць пазбегнуць “ошибкоопасных” момантаў у працэсе падрыхтоўкі.

Сфарміраваная культура навуковага маўлення выяўляе сістэмнасць ведаў, метадычную кампетэнтнасць, назапашаны кагнітыўны вопыт маладога даследчыка. Культура навуковага слова матывуе маладых людзей да ўласных пошукаў, назапашвання вопыту камунікатыўнага ўзаемадзеяння ў прафесійна значымых сітуацыях, карэктнай пабудовы дыялогу з апанентамі, рэцэнзентамі, з усімі, хто мае супрацьлеглыя погляды на праблему.

Культура аўтара навуковага тэксту праяўляецца найперш у веданні структуры і логікі даследавання, у засваенні зыходных кампанентаў, якія раскрываюць сутнасць, ход і вынікі працы. Належнае афармленне гэтых характарыстык падразумявае метадалагічную граматнасць даследчыка. Аперыраванне асноўнымі паняццямі навуковага пазнання — *тэорыя, тэарэтычныя асновы, канцэпцыя, мадэль, методыка, метадычная сістэма, этапы педагагічнага эксперымента* і інш. — прадвызначае метадалагічную граматнасць даследчыка і павышае выніковасць, доказнасць працы.

Такім чынам, метадалагічная культура — гэта сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, якія дазваляюць крытычна засвойваць, ацэньваць навуковыя тэксты, праводзіць рэфлексію ўласнай даследчай дзейнасці. Гатоўнасць да самастойнага даследавання складаюць наступныя ўменні:

– *матывацыйныя*: станоўчыя адносіны да навуковай дзейнасці;

– *інтэлектуальныя*: засваенне зместу, структуры і метадаў даследавання;

– *валявыя*: планаванне ўласнай навуковай дзейнасці;

– *ацэначныя*: здольнасць да адэкватнага самааналізу, самаацэнкі.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Безрукова, В.С. Как написать реферат, курсовую, диплом / В.С. Безрукова. — СПб.: Питер, 2014. — 176 с.

2. Бережнова, Е.В. Требования к курсовым и дипломным работам по педагогике: методические рекомендации для студентов / Е.В. Бережнова. — М.: Пед. общ-во России, 1999. — 48 с.

3. Борикова, Л.В. Пишем реферат, доклад, выпускную квалификационную работу / Л.В. Борикова, Н.А. Виноградова. — М.: Академия, 2012. — 94 с.

4. Виноградова, Н.А. Методические рекомендации по выполнению письменных работ: для студентов педагогических колледжей / Н.А. Виноградова. — М.: Академия, 2009. — 60 с.

5. Виноградова, Н.А. Научно-исследовательская работа студента. Технология написания и оформления доклада, реферата, курсовой и выпускной квалификационной работы / Н.А. Виноградова. — М.: Академия, 2023. — 97 с.

6. Волков, Ю.Г. Как написать диплом, курсовую, реферат / Ю.Г. Волков. — Ростов н/Д, 2005. — 126 с.

7. Грабарь, М.И. Применение математической статистики в педагогических исследованиях: непараметрические методы / М.И. Грабарь, К.А. Краснянсая. — М.: Педагогика, 1987. — 135 с.

8. Даниленко, О.В. Методология и методы психолого-педагогических исследований / О.В. Даниленко, Т.Е. Сергеева, Г.Б. Сидалинова. — Орск: ОГТИ, 2015. — 182 с.

9. Жукова, Е.Д. Организация самостоятельной работы: учебное пособие / Е.Д. Жукова. — М.: Флинта, 2016. — 182 с.

10. Загвязинский, В.И. Методология и методы психолого-педагогического исследования / В.И. Загвязинский. — М., 2007. — 206 с.

11. Исследовательская деятельность студентов: учебное пособие / Т.П. Сальникова. — М.: ТЦ Сфера, 2015. — 96 с.

12. Климова, Т.Е. Научно-педагогическое исследование: программа спецкурса / Т.Е. Климова. — Магнитогорск, 2017. — 92 с.

13. Курсавыя і дыпломныя работы па беларускай літаратуры і методыцы выкладання: дапаможнік / Т.У. Ганчарова-Цынкевіч [і інш.]. — Мінск: БДПУ, 2020. — 92 с.

14. Курсавыя працы па методыцы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах: метадычныя рэкамендацыі / В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, В.І. Свірыдзенка. — Мінск: БДПУ, 2007. — 64 с.

15. Курсавыя працы па методыцы выкладання беларускай мовы: дапаможнік / М.І. Касцян, У.А. Лядоўскі. — Мінск: Выш. школа, 1984. — 60 с.

16. Курсавыя працы па методыцы выкладання беларускай мовы: дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / М.М. Шаўчэнка, В.П. Шаўчэнка. — Мазыр: МДПУ, 2013. — 138 с.

17. Курсовые и дипломные работы: пособие по написанию, оформлению и защите: для студентов всех специальностей педагогического факультета / [Н. В. Михалкович и др.]. — Гродно: ГрГУ, 2009. — 139 с.

18. Львов, М.Р. Методика преподавания русского языка в начальных классах / М.Р. Львов, В.Г. Горецкий, О.В. Сосновская. — М.: Академия, 2017. — 461 с.

19. Львов, М.Р. Словарь-справочник по методике русского языка / М.Р. Львов. — М.: РОСТ, 2017. — 239 с.

20. Методология и методика психолого-педагогического исследования: учебное пособие / В.И. Волынкин. — СПб.: С.-Петерб. ун-т, 2017. — 151 с.

21. Методыка выкладання беларускай мовы. Заданні і практыкаванні: вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. — Мінск: Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2015. — 211 с.

22. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. — 2-е выд. — Мінск: Вышэйшая школа, 2020. — 263 с.

23. Мигуренко, Р.А. Научно-исследовательская работа: учебно-методическое пособие / Р.А. Мигуренко. — Томск: ТГПУ, 2018. — 184 с.

24. Научно-исследовательская работа студента: технология написания и оформления доклада, реферата, курсовой и выпускной квалификационной работы / Н.А. Виноградова, Н.В. Микляева. — М.: Академия, 2015. — 125 с.

25. Неумоева-Колчеданцева, Е.В. Основы научной деятельности студента: учебное пособие для вузов / Е.В. Неумоева-Колчеданцева. — М.: Флинта, 2022. — 120 с.

26. Орехова, Т.Ф. Подготовка курсовых работ по педагогическим наукам: учебное пособие / Т.Ф. Орехова, Н.Ф. Ганцен. — М.: Флинта, 2011. — 139 с.

27. Подготовка организации выполнения и защиты, оформления рефератов, курсовых проектов (курсовых работ), дипломных проектов (дипломных работ), магистерских диссертаций. — Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2025. — 82 с.

28. Подготовка, написание и оформление курсовых, дипломных и научных работ: учебное пособие / Л.П. Канакова, О.И. Загревский. — Томск: ТГПУ, 2003. — 106 с.

29. Рефераты, курсовые и дипломные работы: методика подготовки и оформ.: учебно-методическое пособие / И.Н. Кузнецов. — М.: Дашков и К°, 2025. — 207 с.

30. Розанова, Н.М. Научно-исследовательская работа студента: учебно-практическое пособие / Н.М. Розанова. — М.: Кнорус, 2016. — 256 с.

31. Сластенин, В.А. Педагогика: учебное пособие для студ. пед. учеб. завед. / В.А. Сластенин [и др.]. — М.: Школа-Пресс, 2016. — 543 с.

32. Эйдельман, Л.Н. Методические рекомендации по оформлению рефератов, курсовых и выпускных квалификационных работ: методические рекомендации / Л.Н. Эйдельман, А.А. Баряев, В.Е. Малышева. — СПб.: Рос. гос. пед. ун-т имени А.И. Герцена, 2023. — 55 с.

Вучэбнае выданне

# КУРСАВЫЯ І ДЫПЛОМНЫЯ ПРАЦЫ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Метадычныя рэкамендацыі

Складальнік
**ВАСЮКОВІЧ** Людміла Сяргееўна

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп'ютарны дызайн *Л.В. Рудніцкая*

Падпісана ў друк 29.12.2025. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 2,77. Тыраж 9 экз. Заказ 158.

Выдавец і паліграфічнае выкананне — установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.